Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 28 (442) | Субота, 5 жніўня 1939 года | Цана 20 кап.

## 25-ая ГАДАВІНА ПЕРШАЙ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ

Дваццаць пяць год таму назад, 1 жніўня 1914 года, Германія абвясціла вайну Расіі.

Першую імперыялістычную вайну буржуазія рыхтавала ў глыбокай тайне ад сваіх народаў. І калі разразілася вайна, буржуазныя заправілы ўсяляк абманвалі народ, выдаючы грабіцельскую вайну за «абарону сваёй бацькаўшчыны» ад нападу ворага. Вайна засцігнула народы нечакана, знянацку.

Фактычна-ж віноўнікамі вайны былі буржуазныя кіруючыя класы, а галоўным зачыншчыкам быў германскі імперыялізм. Подлую ролю ў распальванні шавіністычных настрояў у гэтай вайне адыгралі «соцыялісты» з II інтэрнацыянала, гэтыя ўслужлівыя халопы імперыялістаў.

Нямецкія, аўстрыйскія, французскія і другія «соцыялісты» паспяшылі салідарызіравацца са сваімі імперыялістычнымі ўрадамі і заклікалі рабочы клас да братазабойчай вайны.

Яны дасягнулі таго, што чад шавіністычнага ўплыва быў ахапіў значную частку грамадства. Вельмі агідную ролю ў імперыялістычнай бойні адыгралі рускія меншавікі і эсэры, якія абманвалі наш народ гучнымі фразамі аб «абароне сваёй радзімы», заклікалі яго да здзелак, да класавага міру з самым подлым ворагам рабочага класа і ўсіх працоўных — царызмам.

Толькі большэвіцкая партыя на чале з Леніным, ведучы барацьбу з меншавікамі, трацкістамі і эсэрамі, шырока разгортвала сцяг інтэрнацыяналізма, барацьбы з імперыялістычнай вайной, заклікала масы ператварыць грабежніцкую вайну ў вайну грамадзянскую.

Да гэтага-ж заклікала яна рабочых і працоўных усіх ваюючых краін.

«Ленін і Сталін развілі глыбокае марксісцкае вучэнне аб войнах. Большэвікі не супроць усякай вайны». Яны супроць «несправядлівай, захватніцкай, імперыялістычнай вайны. Яны падтрымоўвалі і падтрымліваюць войны справядлівыя, незахватніцкія, вызваленчыя». (Правда»).

Рабочы клас Расіі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, у саюзе з бяднейшым сялянствам, пры падтрымцы салдатаў і матросаў нізрынуў царскую ўладу ў дні Вялікага Кастрычніка і пабудаваў новую соцыялістычную дзяржаву.

Моцна спаментаваныя сталінскай дружбай, народы Совецкага Саюза, глыбока і непахісна адданыя свайму роднаму ўраду і вялікай партыі Леніна—Сталіна, з усёй сілай ненавідзяць імперыялістычную вайну. Але наш народ ніколі не баяўся вайны справядлівай, ён навучыўся абараняць сваю радзіму ад нашэсця варожых зграй.

«Наш народ любіць мір, цэніць яго вялікую выгаду і змагаецца за мір ва ўсім свеце. Але ён умее і ваяваць. І не толькі ўмее, але і любіць ваяваць» (К. Е. Варашылаў). Партыя Леніна—Сталіна, наш народ стварылі і выпеставалі такую Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і такі Ваенна-Марскі Флот, роўных якім не мае і не можа мець ні адна ў свеце фашысцкая краіна. Наша Чырвоная Армія — гэта плоць ад плоці свайго народа-чырвонаармейца, народа-героя.

Другая імперыялістычная вайна пачалася. Подлыя з подлых—нямецкія, італьянскія і японскія фашысты ўцягнулі каля 500 мільёнаў чалавек у новую імперыялістычную вайну. Вайна ахапіла велізарныя прасторы—ад Шанхая да Гібралтара.

Фашысцкія грамілы, распаліўшы другую імперыялістычную вайну, імкнуцца прарвацца да граніц Совецкага Саюза. Але ўсе іх спробы перашагнуць гэтую граніцу церпяць ганебны крах. Увесь свет ведае, чым скончылася спроба японскіх самураяў ступіць са зброяй на совецкую зямлю ў мінулым годзе. Яскрава сведчаць аб магутнасці Совецкага Саюза і падзеі ля Халхын-Гола на граніцы Мангольскай Народнай Рэспублікі. Японская імператарская армія ніколі не цярпела такіх велізарнейшых страт, як церпіць ля Халхын-Гола.

Першая імперыялістычная вайна раскрыла вочы працоўным усяго свету. Вайна паказала праўду і тым людзям, якія доўгі час былі ў палоне пацыфізма. У выніку гэтай вайны лепшыя майстры слова—Андрэ Мальро,Ліон Фейхтвангер і многія другія назаўсёды пакінулі лагер буржуазнага пацыфізма і звязалі свой лёс з пралетарыятам. У супроцьлегласць пісакам - пацыфістам Анры Барбюс напісаў выдатную кнігу «У агні», у якой паказаў сутнасць імперыялістычнай вайны і сапраўдны твар яе арганізатараў. Многа хвалюючых твораў аб вайне напісалі совецкія пісьменнікі.

Зараз, калі фашысты распалілі другую імперыялістычную вайну і рыхтуюць напад на Совецкі Саюз, найбольш чэсныя пісьменнікі капіталістычных краін уключаюцца ў адзіны фронт барацьбы супроць фашызма, за перамогу СССР у будучай вайне з ворагамі соцыялізма. Лепшыя пісьменнікі даказалі гэта сваёй барацьбой з фашызмам у радах рэспубліканскай арміі Іспаніі. У будучай вайне сімпатыі ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва будуць на баку Совецкага Саюза.

Совецкі Саюз, усе народы краіны соцыялізма цвёрда і ўпэўнена ідуць пад сцягам Леніна — Сталіна наперад к комунізму. І гора будзе таму, хто паспрабуе стаць упоперак дарогі гэтаму непераможнаму, несакрушымаму шэствію.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Зм. БЯДУЛЯ

## МУРАШКА ПАЛАШКА

*(Урывак з казкі для дзяцей)*

### IV. У ВАСКОВАЙ ЦЯМНІЦЫ

Пасля доўгіх пакут,
Пасля цяжкіх турбот,
Па галінах Палашка
У вулей паўзла.

Так яна дабрыла
Аж да самых варот.
Раптам крыкнула «стой»
Вартавая пчала:

— Ты чаго сюды ходзіш?
Адкуль ты і хто?
— Шчыра праўду адкрыю,
Не буду ілгаць,

Я з зялёнага бору —
Адгэтуль міль сто.
Я хачу навучыцца
У вас працаваць.

Вартавая ў адказ
Затрубіла у рог.
Наляцела шмат пчол
На трывожны ражок.

Пасадзілі Палашку
Ў цямніцу-астрог.
І павесілі з воску
На дзвярах замок.

Цёмна, цёмненька там,
Ціха, ціхенька там
Аглушыла яе
Глухата, цемната.

Пацягнулася думкай
Палашка к кустам:
«Эх, сядзела-б цяпер
У бары ля куста...»

І пачала мурашка
Палашка спяваць:
«Сонца, сонца, спалі ты
Цямніцу агнём!
Ветрык, ветрык, спрабуй
Мой астрог зруйнаваць!
Мышка, мышка, разбі ты
Цямніцу хвастком!».

Перад ёй на падлозе
І хлеб і вада,
Арыштанцкі халат,
Арыштанцкі сяннік.
На душы арыштанткі —
Туга і нуда.
За сцяной без канца
Туп і туп вартаўнік.

Трое сутак сядзела
У цямніцы глухой.
Раптам скрыпнулі дзверы,
Святло напльло.
«Ну хадзем!» — павялі. —
«Тут хвілінку пастой!».
Штосьці новым цяжарам
На сэрца лягло.

Адну думала думу:
«За што так мяне?
За якія грахі?
За якую бяду?
Хачу-ж пчолам дабра
І на яве і ў сне.
Хачу-ж толькі дабра
Іх дуплу, іх гнязду».

Раптам чуе загад:
«Да Матулі хадзем!»,
Павялі па завулках,
Вялі цераз мост.
Далі боцікі з воску:
«На ногі адзень,
Бо ты ног не памыла,
Запыліш памост».

### V. ГУТАРКА МІЖ МАТУЛЯЙ І ПАЛАШКАЙ

Вось і зал, дзе Матуля
На крэсле сядзіць.
Перад ёй на стале
Стаіць коўш залаты.
У каўшы залатым
Мёд пахучы блішчыць.
Яна пробуе мёд:
Ці стары, ці густы.

— Ты, мурашка, скажы, —
Гэта буры мядзведзь
Цябе к нам у дупло
Падаслаў з-за кустоў?
Касалапы прыслаў
Прасачыць, паглядзець,
Як тут з сотамі справа,
Ці мёд наш гатоў?

— О, не так! Я прышла
Паглядзець, як тут вы
Ўсе працуеце разам
Адной грамадой.
Я вучыцца прышла
К вам у час веснавы.
Як і нам жыць сям'ёй
Мураўінай адной.

Мы — мурашкі —
Гарапашны народ.
Паасобку працуем
І трацім шмат сіл.
У зялёным бары
Галадуе наш род.
У нас мала хацін,
У нас многа магіл.
Горка плача Палашка,
Лье слёзы і лье.
І праз слёзы ўвесь час
На Матулю глядзіць.
І Матуля вачэй
Не спускае з яе.
Моршчыць лоб, уздыхае:
«Як можна так жыць?».

Бачыць — вочы Палашкі
Не вочы, а боль.
Чуе — голас Палашкі
Не голас, а стогн.
А Палашка сама
Не Палашка—мазоль.
Аж за сэрца бярэ
Сумных слоў шчыры тон.

І сказала Матуля:
«Ты наша сястра.
Жыві з намі. Вучыся
У нас працаваць.
Праца цешыць, як спеў,
Як на скрыпцы ігра.
Не маглі-б мы без працы
Ні есці, ні спаць».

І сказала Матуля:
«Глядзі на наш лад,
Як збіраем мядок,
Як гадуем малых,
Як будуем дамы,
Вылятаем у рад,
Прылятаем у рад
Да малых і старых».

І сказала Матуля:
«Мядзведзь любіць мёд.
Ён разбойнік і злодзей,
Гультай, абібок.
Ён зараз можа з'есці,
Што зробім за год.
Вось мы выбралі месца
Высока знарок».

І сказала Матуля:
«Ён лазіць да нас,
Касалапы ласун,
Нашы соты бярэ.
Хоць мы колем у бельмы
Яго кожны раз,
Хоць ён коціцца ўніз,
Зямлю носам арэ».

І сказала Матуля:
«Ты з намі пабудзь,
Колькі хочаш жыві
І працуй у вуллі.
А пра лютых звяроў
Ты, сястра, не забудзь,
Там, дзе нельга рукой —
Думку-розум прышлі».

Пакланілася нізка
Палашка пчале:
«О, Матуля, Матуля,
Жыві многа лет!
Гараваў мой народ
У пакуце і мгле.
А парада Матулі
Нас вывядзе ў свет».

Пакланілася нізка
Палашка пчале:
«Будуць нашы мурашкі
Спяваць пра цябе.
Ты, як родная маці,
Сустрэла мяне.
Я і сэрцам і думкай
Належу табе».

## У САДЗЕ

В. ГУЦЬКО

Красою майскаю сады
Прайшлі прад намі цёплай ласкай,
І недзе ў далях шызы дым
Упаў на чэрвеньскія краскі.
Праходзіш сцежкаю —
шуміць
Краса зялёная, густая.
І вецер мяккімі грудзьмі
К ёй з далі сіняе сплывае.
Сплывае вецер.
І лісты
Шапочуць ціха, палахліва...
За строем яблыняў густых
Растуць мічурынскія слівы.
Праз момант — ціш.
Стаяць сады.

Краямі ліст не страпянецца;
І лёгка ў садзе маладым
Тады становіцца на сэрцы.
Спыняюся: ігруш рады...
Вішняк у полымі пажару.
Звісаюць буйныя плады
Са следам першага загару.
Надыйдзе ліпень —
ружавець
Пачне і рэшта садавіны

І нас гасцінна пазаве
Спачыць у вольную часіну.
Як з вокан першыя агні
Ружанцы высцеляць ля плота —
Падыйдзе пільны вартаўнік
Да гурту нашага ўпотай.
Абыйдзе сад свой па расе.
Вачыма ўсё як ёсць абмерыць
І на адходзе прынясе
На кожнага па слуцкай бэры.
Мінае ноч.
З трысця ляшчы
На нераст свой выходзяць ласа.
Ідзём дамоў.
Вакол блішчыць
Воск буйных яблыкаў калгасных.

## Конкурс на аднаактную п'есу для самадзейнага тэатра

Першага жніўня ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР адбылася нарада, прысвечаная ўсесаюзнаму конкурсу на аднаактную п'есу для самадзейнага тэатра. Прадстаўнік Усесаюзнага дома народнай творчасці імя Н. К. Крупскай тав. Коган паведаміла аб задачах і ўмовах конкурса.

Попыт з боку драматычных гурткоў на аднаактныя п'есы вельмі вялікі. Паводле далёка няпоўнага ўліку, у Совецкім Саюзе налічваецца звыш 30 тысяч рабочых і калгасных драматычных гурткоў, якія літаральна закідваюць Усесаюзны дом народнай творчасці і Цэнтральны дом мастацкай самадзейнасці ВЦСПС просьбамі аб прысылцы п'ес. Аднак, гэтыя арганізацыі не могуць задаволіць просьбы, бо лік аднаактных п'ес для самадзейных гурткоў вельмі невялікі.

Тав. Коган звярнулася да пісьменнікаў і драматургаў БССР з просьбай прыняць самы актыўны ўдзел у гэтым конкурсе і даць самадзейнасці рад каштоўных і высокамастацкіх п'ес.

Прадстаўленыя на конкурс п'есы павінны адпавядаць наступным патрабаванням: высокая ідэйна-мастацкая якасць, нескладанасць сцэнічнай пастаноўкі, абмежаваная колькасць дзеючых асоб — не звыш 8. Творы павінны быць арыгінальнымі і не перавышаць аднаго аўтарскага (друкаванага) аркуша. Побач з пісьменнікамі ў конкурсе могуць прыняць удзел усе грамадзяне Совецкага Саюза.

За лепшыя творы ўстаноўлена 12 прэмій, у тым ліку 3 першых прэміі па 15 тыс. рублёў, 2 другіх прэміі па 10 тыс. рублёў, 3 трэціх прэміі па 7 тыс. рублёў і 4 чацвертых прэміі па 5 тыс. рублёў.

Тэрмін падачы матэрыялаў—да 20 лістапада 1939 года. Конкурс закрыты.

На нарадзе выступілі тт. Клімковіч, Озірскі і інш. Пісьменнікі і драматургі БССР запэўнілі прадстаўнікоў Усесаюзнага дома народнай творчасці, што яны прымуць у конкурсе самы актыўны ўдзел.


І. П.





**Фізкультурны парад у Мінску 30 ліпеня.** На здымках: злева—калона фізкультурнікаў РСЧА, справа — калона фізкультурнікаў пагранічных войск НКВД у часе марша перад трыбунай на плошчы імя Леніна.

Фотахроніка БЕЛТА.



Павільён Беларускай ССР на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве.

Фотахроніка ТАСС.

## СКУЛЬПТУРА Ў БЕЛАРУСКІМ ПАВІЛЬЁНЕ

Адкрыўшаяся ў Маскве Ўсесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка сведчыць не толькі аб перамозе калгаснага ладу і аб калгасным багацці, але з'яўляецца таксама і сведчаннем выдатнага росквіту мастацтваў нашай соцыялістычнай радзімы: яе архітэктуры, жывапісу і скульптуры. Бадай, ніколі яшчэ да гэтага ў нашай краіне ў такім велізарным мастацкім ансамблі не выступалі мастацтвы братніх рэспублік нашай краіны, як на гэтай выстаўцы.

Беларускі павільён на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы — гэта, бясспрэчна, велізарная перамога беларускіх скульптараў і жывапісцаў, а таксама майстроў народнай самадзейнай мастацкай творчасці, гэта новая веха на шляху развіцця беларускага выяўленчага мастацтва.

Першая скульптурная кампазіцыя, з якой сустракаецца наведвальнік беларускага павільёна, гэта выкананая А. Орловым скульптурная група «Пагранічнік і калгасніца». Група гэта ўстаноўлена перад уваходам у павільён, на фоне спецыяльнага экрана. Абрамленнем для экрана служыць вялікае дэкарацыйнае панно, выкананае разьбой па дрэву засл. дзеячом мастацтваў А. Грубэ.

Само месца, адведзенае для скульптурнай групы, падказвала ўжо характар яе кампазіцыі. Трэба было стварыць такую кампазіцыю, якая найбольш поўна раскрыла-б характар беларускага павільёна, як павільёна пагранічнай рэспублікі, фарпоста совецкай краіны на яе заходніх рубяжах. Гэтай задачы ўпаўне адпавядае знойдзенае скульптарам рашэнне.

Скульптурная група паказвае пагранічніка і калгасніцу, якія праследуюць парушальніка граніцы. Орлову ўдалося выразіць скульптурнымі сродкамі значнае развіццё дзеі: калгасніца паказвае рукой у бок выяўленага ёю парушальніка, пагранічнік сканцэнтравана і з рашучасцю глядзіць наперад, у правай руцэ ў яго маўзер, левай рукой ён спускае з павадка сабаку, які пачуў блізкасць ворага. Усё гэта дадзена ў дынаміцы. Орлоў змог надаць формам значную пластычнасць, выразіць прыгажосць і суровую мужнасць совецкіх людзей, аберагаючых недатыкальнасць совецкай граніцы.

Асабліва ўдалы вобраз калгасніцы, для якой у большай меры, чым для пагранічніка, скульптар змог знайсці абагуленыя, разлічаныя на адкрытае паветра, манументальныя формы.

У скульптуры маладой калгасніцы мы бачым не толькі патрыятызм і адвагу совецкага чалавека, — скульптар у значнай меры змог раскрыць у гэтым вобразе культурны і грамадскі рост калгаснай дзяўчыны. Яе рухі простыя і пластычныя, як у фізкультурніцы. Ва ўсёй яе фігуры вы адчуваеце адухоўленасць і грамадскую свядомасць. Перад вамі вобраз, у якім вы пазнаеце вялікую праўду сталінскай эпохі, сціраючай межы паміж горадам і вёскай, паміж фізічнай і разумовай працай.

Скульптура пагранічніка менш удалася Орлову. Пры ўсёй вонкавай дынамічнасці вобразу пагранічніка нехапае ўнутранага руху і характару; вобраз пагранічніка некалькі халаднаваты. У гэтым, напэўна, сказаўся яшчэ непераможаны скульптарам метад адцягненай ад вобраза «акадэмічнай» штудыроўкі скульптурнай формы. У цэлым-жа гэта скульптурная кампазіцыя з'яўляецца бясспрэчным і вялікім творчым дасягненнем А. Орлова і яго кансультанта — засл. дзеяча мастацтваў М. Керзіна.

Наведвальнік уваходзіць у аванзалу павільёна. Тут ён бачыць скульптурныя рэльефы, як-бы прадаўжаючыя тэму скульптурнай групы ля ўваходу. Цэнтральны рэльеф выканан засл. дзеячом мастацтваў А. Бембелем, баковыя рэльефы — скульптарамі В. Рыцэрам і Г. Ізмайлавым. На цэнтральным рэльефе скульптар Бембель паказвае Беларусь як узброены фарпост совецкай краіны. У цэнтры кампазіцыі рэльефа мы бачым групу: лётчыка са сцяжком у правай руцэ, рабочага з процівагазам, парашутыстку, пагранічніка і танкіста. Справа і злева ад гэтай групы кампазіцыю замыкаюць танкі, самалёты і артылерыя, гатовыя па сігналу сцяжка, што знаходзіцца ў руцэ лётчыка, абрушыцца ўсёй сваёй страшэннай і сакрушальнай магутнасцю на ворага, калі ён паспрабуе пасягнуць на совецкую зямлю.

Гэты скульптурны рэльеф, бясспрэчна, лепшая праца Бембеля за апошнія годы. Тут, не ў прыклад многім ранейшым сваім працам, Бембель у значнай меры змог перамагчы схематызм, змог стварыць нават сродкамі рэльефа манументальныя вобразы совецкіх людзей. Пры ўсёй, здавалася-б, плоскаснасці рэльефа, Бембелю ўдалося надаць скульптурным формам аб'ёмнасць і выразнасць. Калі ў ранейшых працах Бембеля цяжка было знайсці тыпаж, паколькі характарыстыка тыпажу давалася скульптурам толькі вонкавымі, аксесуарнымі сродкамі, дык у гэтым рэльефе Бембель у значнай меры змог знайсці характарыстыку для кожнага вобраза ў паасобку. У гэтым рэльефе Бембель з яшчэ большай пераканальнасцю паказаў сябе майстрам кампазіцыі, скульптарам, які добра валодае манументальнай формай.

Некалькі слабей па сваёй мастацкай выразнасці баковыя рэльефы В. Рыцэра і Г. Ізмайлава. Мы бачым на гэтых рэльефах добра скампанаваную групу фізкультурнікаў, а таксама калгаснікаў у полі, якія гутараць у часе абедзенага перапынку з чырвонаармейцамі. Рэльефы гэтыя ўдалыя па кампазіцыі, але Рыцэру і Ізмайлаву не ўдалося перамагчы іх плоскаснасць, ад чаго рэльефы ўспрымаюцца галоўным чынам як сілуэтныя.

Адно з цэнтральных месц ў інтэр'еры галоўнай залы займае выкананая засл. дзеячам мастацтваў З. Азгурам скульптурная кампазіцыя «Ленін і Сталін». Гледзячы на экспанаты павільёна, якія характарызуюць выдатныя дасягненні сельскай гаспадаркі Беларусі, гледзячы на жывапісныя фрызы, выкананыя беларускімі жывапісцамі В. Волкавым і І. Ахрэмчыкам, на тэмы барацьбы беларускага народа за сваю соцыялістычную дзяржаўнасць і на тэмы працы, вы з яшчэ большай паўнатой успрымаеце зваяныя скульптарам вобразы вялікіх правадыроў чалавецтва Леніна і Сталіна, як арганізатараў і натхніцеляў усіх тых гіганцкіх перамог беларускага народа, якія ў гэтым павільёне прадстаўлены.

З. Азгур паказаў Леніна і Сталіна ідучымі. Ленін, даверліва паклаўшы левую руку на плячо Сталіна, паказвае яму правай рукой шлях к комунізму. Сталін у шынелі, з шапкай у левай руцэ, як-бы сабраўшыся ў далёкі шлях, сканцэнтравана глядзіць наперад, ва ўказаны Леніным бок. Кампазіцыя, такім чынам, раскрывае вобраз Леніна — правадыра і настаўніка і вобраз Сталіна — вернага заступніка і прадаўжальніка вялікай справы Леніна.

Адзначаючы вартасці кампазіцыі, нельга не адзначыць, што па сваіх мастацкіх сродках гэта скульптурная група значна ніжэй замыслу кампазіцыі. Нам думаецца, што і ў гэтай скульптуры, як і ў радзе другіх работ, сказаўся «аўральны» метад работы Азгура. Вонкава знойдзенае скульптарам адзінства кампазіцыі не даведзена ў самых формах, — гэтым формам нехапае пластычнасці і падпарадкавання іх унутранаму зместу вобраза. Адчуваецца, што як і ў многіх ранейшых сваіх работах, Азгур будуе скульптуру не «знутры», а шукае вобраз праз адцягненую часам ад самога зместу форму, што і накладвае некаторы халадок на яго работы.

Азгуру больш удалася скульптура таварыша Сталіна. Тут скульптарам дасягнута значная манументальнасць, прастата і сцісласць волевай характарыстыкі правадыра. Вялікая работа, прароблена да гэтага Азгурам над партрэтамі Сталіна, дапамагла тут скульптару.

Менш удалася яму скульптура Ільіча. Азгур празмерна заграмадзіў яе вопраткай, некалькі засланяючай вобраз ад гледача; сам вобраз Леніна ахарактарызаван аднабакова. Вам хочацца бачыць у вобразе Леніна больш бацькоўскай цеплыні і сардэчнасці. У Азгура-ж вобраз Леніна атрымаўся празмерна суровым, што некалькі расхалоджвае кампазіцыю.

У цэлым прадстаўленыя ў беларускім павільёне новыя работы беларускіх скульптараў сведчаць аб далейшым іх творчым росце і аб росце беларускай скульптуры наогул. З поўным правам можна сказаць, што Ўсесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка, у тым ліку і беларускі павільён,— вялікае і радаснае свята перамог соцыялістычнай працы і перамог совецкага мастацтва.


А. ДАЛІН.

## ПЕРАПІС ПОМНІКАЎ

На тэрыторыі БССР знаходзяцца дзесяткі помнікаў, якія маюць велізарнейшае палітычнае, гістарычнае і мастацкае значэнне (домік першага з'езда РСДРП у Мінску, дом у Гомелі, дзе жыў і працаваў Л. М. Кагановіч, дом у Магілёве, дзе жыў і працаваў Серго Орджанікідзе, могілкі дукорскіх партызанаў, Сафійскі сабор у Полацку і інш.).

У бліжэйшыя дні ў БССР пачнецца перапіс—паспартызацыя помнікаў рэволюцыі, грамадзянскай вайны, гісторыі і мастацтва. Перапіс павінен упарадкаваць улік помнікаў і ахову іх.

29 ліпеня на пасяджэнні аргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Мінскай вобласці прынята рашэнне аб арганізацыі абласной камісіі па ахове помнікаў. У складзе камісіі—старшы навуковы работнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР І. А. Сербаў, засл. дзеяч мастацтваў А. А. Бембель, старшыня Саюза мастакоў І. М. Рубінштэйн, заг. аблАНА тав. Чарноў і інш. 7 жніўня пачынаецца рэгістрацыя і паспартызацыя помнікаў па Мінску і Мінскай вобласці. У гэтай рабоце, апрача членаў камісіі, прымуць удзел засл. дзеяч мастацтваў скульптар Грубэ, архітэктар Дзяніскаў, дацэнт Беларускага універсітэта Дудкоў і інш.



«Разбраенне пад кіраўніцтвам Л. М. Кагановіча карнілаўскіх эшалонаў у Гомелі»—эскіз карціны маст. Гаўрыленка для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Фота І. Каплінскага.

# РАБОТНІКІ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ВІТАЮЦЬ НОВУЮ ПАЗЫКУ

## МІТЫНГ У ПІСЬМЕННІКАЎ

З вялікім здавальненнем і радасцю спаткала пісьменніцкая грамадскасць сталіцы БССР паведамленне аб выпуску новай унутранай пазыкі—Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года).

Нікога не трэба было клікаць, нікому не трэба было напамінаць: у дзень апублікавання дэкрэта аб пазыцы раніцою пісьменнікі ўсе як адзін прышлі ў Дом пісьменнікаў выканаць свой грамадзянскі доўг — падпісацца на пазыку, пазычыць дзяржаве свае зберажэнні.

Мітынг быў назначан а першай гадзіне дня. Але задоўга да мітынга 57 чалавек падпісаліся на суму звыш 35 тысяч рублёў. Народны паэт БССР Якуб Колас падпісаўся на 2500 руб., пісьменнікі Броўка, Глебка, Крапіва падпісаліся на 2 тысячы рублёў кожны, Гурскі, Бядуля—на 1500 рублёў, Фінкель, Пасляновіч, Стаховіч, Камянецкі—на 1000 рублёў і г. д.

Мітынг пацвердзіў, што пісьменніцкая грамадскасць ахоплена высокімі патрыятычнымі пачуццямі. З кароткім дакладам аб пазыцы выступіў тав. Стаховіч.

— Увесь совецкі народ, — сказаў тав. Стаховіч,—горача вітае новую пазыку, таму што наш народ, моцна згуртаваны вакол партыі большэвікоў, любіць сваю соцыялістычную радзіму і ведае, што пазыка дапамагае яе росту і росквіту, умацняе яе абаронную магутнасць, робіць яе межы ўсё больш непрыступнымі, паляпшае добрабыт усіх працоўных СССР.

Вялікі пролетарскі пісьменнік А. М. Горкі пісаў: «Усякі, хто ўдзельнічае ў пазыцы—удзельнічае ў справе ўмацавання свабоды, заваяванай народам цаною сваёй крыві».

Кожны патрыёт нашай соцыялістычнай радзімы горды ўсведамленнем таго, што ён актыўна дапамагае росквіту совецкай краіны сваёй працай, сваімі зберажэннямі.

З гарачымі прамовамі выступілі на мітынгу тт. Клімковіч, Мальцінскі, Герцовіч, Барысаў, Мазо, маладыя аўтары, якія займаюцца зараз на курсах-канферэнцыі пачынаючых аўтараў, тт. Станкевіч, Місюн і інш.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі пісьменнікі і супрацоўнікі апарата Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР вітаюць выпуск дзяржаўнай Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года).

«Мы ведаем,—гаворыцца ў рэзалюцыі,—што сродкі ад новай пазыкі будуць скарыстаны на выкананне вялікіх задач трэцяй пяцігодкі. Мы ведаем, што дружнай падпіскай на пазыку мы дапамагаем умацаванню гаспадарчай і абароннай магутнасці СССР, далейшаму ўздыму культуры і заможнасці працоўных, а гэтым самым—ажыццяўленню вялікай задачы, пастаўленай таварышам Сталіным перад нашай дзяржавай: дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах. Кожны з нас з вялікай радасцю аддасць свае зберажэнні дзяржаве, кожны з нас з ахвотай падпішацца на новую пазыку.

Няхай жыве наша соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве наш родны і дарагі правадыр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!»

***

Да канца дня 3 жніўня падпіска на пазыку па Саюзу совецкіх пісьменнікаў дасягнула 37.280 рублёў. Падпіска прадаўжаецца.

Вельмі актыўна праходзіць падпіска на пазыку па прадпрыемствах мастацтваў.

◆ У Дзяржаўным цырку праз гадзіну пасля паведамлення аб новай пазыцы выйшла насценная газета, прысвечаная пазыцы, вывешаны лозунгі, плакаты, да цэхаў прымацаваны актывісты—грамадскія работнікі. Перад пачаткам прадстаўлення адбыўся мітынг. Пасля мітынга адразу-ж пачалася падпіска. Да першага антракта было ахоплена падпіскай 100 чалавек. Многія работнікі падпісаліся на месячны заработак. 121 чалавек пры месячным фондзе зарплаты ў 47.400 рублёў падпісаліся на 40.665 рублёў. Частка работнікаў падпіскай яшчэ не ахоплена.

◆ Амаль закончыў падпіску на пазыку Палескі абласны драматычны тэатр. 86 чалавек падпісаліся на 29.860 рублёў, што складае 100,1 проц. фонда месячнай зарплаты. Не падпісаліся яшчэ два чалавекі, якія знаходзяцца ў адпачынку.

◆ У Тэатры оперы і балета ахоплена падпіскай на пазыку 555 чалавек з 605. Сума падпіскі дасягнула 199.565 рублёў. Мастацкі кіраўнік тэатра тав. Шлепянаў падпісаўся на 4.000 рублёў, мастак Нікалаеў на 2.000 рублёў.

◆ Тэхнічны персанал Яўрэйскага тэатра БССР ў колькасці 47 чалавек падпісаўся на 7.380 рублёў, што складае 100 проц. месячнага фонда зарплаты.

◆ У Радыёкамітэце апрача 162 штатных работнікаў ахоплена падпіскай на пазыку 11 пазаштатных. Падпіска складае 74.065 рублёў.

◆ У Саюзе мастакоў падпісаліся на пазыку 18 чалавек на 13.600 рублёў. Засл. дзеяч мастацтваў тав. Бембель унёс першы ўзнос у суме 300 рублёў, мастак В. В. Волкаў унёс першыя 500 рублёў.

◆ Калектыў Заслаўльскага калгасна-соўгаснага тэатра ў складзе 36 чалавек падпісаўся на поўны месячны фонд зарплаты—12.970 рублёў.

◆ 49 работнікаў Рагачоўскага калгасна-соўгаснага тэатра падпісаліся на 15.400 руб. пры месячным фондзе зарплаты ў 15.136 рублёў.

Гэта весткі першых двух дзён падпіскі на новую пазыку. Амаль ва ўсіх калектывах падпіска прадаўжаецца.

# БАЯВОЕ МАСТАЦТВА

Чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць з'яўляецца выражэннем грамадска-масавай работы ў РСЧА. Яна—велізарны і магутны сродак умацавання баявой гатоўнасці войск Чырвонай Арміі, сродак патрыятычнага выхавання мас, сістэма, праз якую баец і камандзір авалодваюць вялікай культурай народнага мастацтва, культурай чалавецтва.

З кожным днём мацнее несакрушальная і магутная сіла Чырвонай Арміі і, побач з гэтым, усё прыгажэй квітнее яе мастацтва, якое з'яўляецца нічым іншым, як народнай творчасцю ў масах Чырвонай Арміі. Мастацтва гэта заклікана выконваць функцыю меткай зброі — баявой песні, вострага слова, задорнага танца. Гэтыя аксесуары, роўна як штых і куля лепшага ў свеце байца, байца Чырвонай Арміі, пойдуць у бой, пойдуць на ворага разам з танкамі, разам з казачымі эскадронамі, паляцяць з самалётамі. Яны ў баю падтрымаюць дух байца-рэвалюцыянера, створаць уздым, які нараджае доблесць і забяспечвае перамогу.

У 1939 годзе, годзе вялікіх дасягненняў у баявой падрыхтоўцы Чырвонай Арміі, росквіт чырвонаармейскай мастацкай творчасці дасягнуў небывалых памераў. Чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць стала сапраўды масавай, мастацка спелай, палітычна вострай, насычанай злобаю дня. У ёй вызначыўся вялікі зрух у сэнсе авалодання класічнай музычнай культурай.

Прагляды чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, праведзеныя ў войсках БАВА, прыцягнулі тысячы ўдзельнікаў. Сотні калектываў выявілі дзесяткі таленавітых выканаўцаў.

Культура харавога мастацтва стала неад'емнай часткай чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Выраслі і па-мастацку ўмацаваліся дзесяткі добрых харавых калектываў—змешаных хораў, мужчынскіх і жаночых ансамбляў. Выявіліся хоры з выдатнай падрыхтоўкай: змешаныя хоры, кіруемыя Грыгор'евай, жонкай чырвонаармейца Беловай і чырвонаармейцам Беловым, жаночыя вакальныя ансамблі, кіруемыя камандзірамі Сеўскім і Вігдорчыкам; казачы хор пад кіраўніцтвам камандзіра Ананьева і г. д. Рэпертуар хораў складаны і разнастайны: песні совецкіх кампазітараў аб Сталіне, баявыя песні Чырвонай Арміі, песні аб геройчных справах ля возера Хасан, класічныя оперныя хоры рускіх і заходніх кампазітараў. Выдатны хор, якім кіруе капельмейстар Дзегцяранка, выконвае шасцігалосную паэму аб Сталіне кампазітара Хачатурана. Бліскуча выконвае рускія народныя песні ў кампазітарскай апрацоўцы хор пад кіраўніцтвам чырвонаармейца Белова. У рэпертуары хора, якім кіруе жонка чырвонаармейца Белова, складаны твор Шэхцера «О чем тоскует Волга» і рускі народны хор «Ноченька». Заслугоўвае выключнай увагі ансамбль рускай народнай песні пад кіраўніцтвам малодшага камандзіра Фіжэнка. Рэпертуар ансамбля — рускія народныя песні ў апрацоўцы Захарава (рэпертуар хора Пятніцкага). Ансамбль шырока вядомы ў часцях БАВА і карыстаецца вялікай папулярнасцю.

Салісты вакалу ў чырвонаармейскай творчасці маюць не малую ўдзельную вагу. Тут відаць вялікая і ўпартая работа па авалоданню класічнай культурай. Найбольш выдатныя спевакі і спявачкі: ваенурач 3 ранга Пічугін (бас), ваентэхнік 2 ранга Дзянісаў (бас), лейтэнант Дубяга (барытон), чырвонаармеец Смаленскі (лірычны тэнар), жонкі камандзіраў Лагвінава (каларатурнае сапрана), Шафраноўская (мецца-сапрана), Кусцікава (драматычнае сапрана), Шашкова (жанр народных песень). Усе гэтыя людзі авалодалі высокай культурай вакальнага выканання, якая па якасці стаіць не ніжэй прафесіянальнай.

Музычныя ансамблі і джазаркестры опабарнічалі на праглядах у вялікай колькасці і выклікалі надзвычайную цікавасць у сэнсе разнастайнай інтэрпрэтацыі адных і тых-жа рэчаў і велізарнай разнастайнасці рэпертуару. Асабліва варта адзначыць домравы ансамбль пад кіраўніцтвам чырвонаармейца Васільева. Ансамбль досыць паспяхова вывучыў складаныя музычныя рэчы, карыстаючыся нечуванымі метадамі развучвання, а выключна нотнай сістэмай.

На праглядах прайшло шмат майстроў балалаечнікаў. Шырока распаўсюджаны ў часцях БАВА змешаныя струнныя ансамблі. Джазаркестр пад кіраўніцтвам малодшага камандзіра Швейцбата з'яўляецца па-майстэрску сыграным ансамблем з вялікім, добра падрыхтаваным рэпертуарам. Джаз выконвае рэчы свайго кампазітара-самавучкі чырвонаармейца Супаніцкага. Вакальныя партыі ў джазе вядзе малодшы камандзір Барон, які з'яўляецца бліскучым спеваком джазавага плана. Увесь рэпертуар джаза — баявыя совецкія песні.

Варта асобна адзначыць майстэрства скрыпача-саліста чырвоназмейца Беразоўскага, які іграе творы Крэйслера, Дворжака і інш. Піяніст-самавучка Супаніцкі робіць свае інтэрпрэтацыі музычных твораў Гліэра, Рахманінава і інш., здзіўляючы тэхнікай свайго выканання.

Вырасла шмат новых танцавальна-плясавых калектываў. Народныя танцы, пляскі, чырвонаармейскія пляскі ў рабоце калектываў дасягаюць значнай адшліфаванасці, выдатных кампазіцый. Паказаныя на праглядах «гапакі», «лявоніхі», рускія пляскі стаяць на высокім узроўні мастацкай пастаноўкі, выдатныя па замыслу. Асабліва добрыя «гапакі», пастаўленыя жонкамі камандзіраў Велікалепавай, Рэдкінай, Лашмаковай і Малзеноўскай; «лявоніха» у пастаноўцы жонкі камандзіра Пуставетавай; чырвонаармейскія пляскі, пастаўленыя малодшым камандзірам Еўтушэнка і малодшым камандзірам Фіжэнка. Плясавы калектыў, кіруемы Пуставетавай, паспяхова працуе над цыклам беларускіх народных танцаў.

На праглядзе прайшло шмат выключна здольных і таленавітых чырвонаармейскіх майстроў мастацкага чытання. Чырвонаармеец Адучыеў выдатна выконвае маналог Барыса з трагедыі «Барыс Гадуноў» Пушкіна. У асаблівай пашане Джамбул,—яго творы па-майстэрску выконваюць жонкі камандзіраў Папсуй-Шапко, Курылына, Аўдзеева. Выдатна чытаюць Маякоўскага чырвонаармейцы Мышасты і Гарцман.

Чырвонаармейскае зацейніцтва як ніколі стала цікавым у сваёй разнастайнасці. Зацейныя плясуны, частушачнікі, зацейнікі-інструменталісты, акрабаты-эксцэнтрыкі занялі ў праглядах вялікае месца. Чырвонаармейцы Старчын, Палетаеў і Макаранка бліскуча падражаюць джазу. Чырвонаармейцы Падкарытаў і Шышоў паказваюць у вялікім бляску і выдатным тэмпе каскадную акрабатыку. Чырвонаармеец Брунзас арганізаваў лялечны тэатр, яго спектакль «Каго мы білі, бьем и будем бить» мае велізарны поспех.

Але самае галоўнае, што неабходна адзначыць у чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, гэта рост кадраў кіраўнікоў. Асабліва гэта прыкметна ў танцавальна-плясавым жанры. Актыў самадзейнасці крэпне, вылучаючы з свайго асяроддзя здольных кіраўнікоў.

Баявая магутнасць і складаная тэхніка Чырвонай Арміі няўхільна растуць, асабовы склад Чырвонай Арміі становіцца з кожным днём усё вышэй і вышэй па сваёй культуры і культурнасці. Няўхільна, у ногу з ростам Чырвонай Арміі, расце і квітнее чырвонаармейскае самадзейнае мастацтва, задачы якога ў абстаноўцы РСЧА ганаровыя і адказныя. **У. МУРАТ.**

## ПАДЗЯКА КАЛЕКТЫВУ ЛЕНІНГРАДСКАГА ТЭАТРА

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР адзначыла ў спецыяльным загадзе, што гастролі Ленінградскага тэатра імя Ленінградскага Совета пад кіраўніцтвам С. Э. Радлова з'явіліся буйнай падзеяй у мастацкім жыцці сталіцы БССР. Спектаклі далі магчымасць гледачам Мінска азнаёміцца з радам класічных твораў: «Гамлет», «Рамео і Джульета», «Отэлло» і інш., а таксама з п'есамі совецкіх драматургаў у высокаякасным выкананні.

Упраўленне па справах мастацтваў абвясціла падзяку мастацкаму кіраўніку Ленінградскага тэатра С. Э. Радлову, дырэктару тэатра Олесічу і ўсяму калектыву, які быў заняты ў гастрольных спектаклях.



Кадр з кінофільма «Коннікі».

# „КОННІКІ“

## (Кіеўская кіностудыя, 1939 год)

Ціхая украінская вёска. Здалёку даносіцца меладычная, сумная песня. Гэта спяваюць дзяўчаты. Пакой і цішыня. І раптам грозная, цяжкая музыка ўрываецца ў гэту цішыню. Грукат салдацкіх кованых ботаў заглушае пявучую мелодыю: у мірную вёску ўваходзяць чорныя палкі нямецкіх акупантаў. З грукатам выламліваюцца дзверы і вокны. Нямецкія салдаты, пад плач і стогны жанчын, валакуць з хат ўсё, што трапіла пад руку. Тры немцы ў касках гоняць статак белых, як снег, гусей. Гусі жаласліва крычаць, выцягваюць шыі. Здаецца, што нават яны адчуваюць смерць і гібель, прынесеную гэтымі людзьмі. А паблізу ўжо гараць мазанкі. З вішань з сухім шорхатам асыпаецца абгарэлае лісце. Пры святле зарава нямецкі канвой вядзе да шыбеніцы мясцовых комуністаў. Ужо прыгатаваны петлі. Кат збіраецца зрабіць сваю крывавую справу. І ў гэты час здалёку—чарывістыя, як лавіна, і ярасныя, як смерч—налятаюць коннікі. Твары асуджаных да смерці асвятляе сонечная ўсмешка. Нямецкія салдаты, пакінуўшы зброю і нарабаванае, уцякаюць.

Так пачынаецца новы фільм «Коннікі», пастаўлены рэжысёрам І. Саўчанка ў Кіеўскай кіностудыі.

Фільм «Коннікі» зроблен па аднайменнай кнізе украінскага пісьменніка Юр. Яноўскага. Кнігай навел «Коннікі» дагэтуль мала вядомы чытачу Яноўскі заваяваў сімпатыю. У гэтай выдатнай кнізе, прасякнутай рамантыкай і гераізмам, патрыятызмам і беззаветнай адданасцю справе рабочага класа, перад чытачом яскрава прадсталі дні грамадзянскай вайны на Украіне. Шахцёры, рыбакі і земляробы, як казачныя багатыры, садзіліся на тачанкі і ў сёдлы і, не шкадуючы свайго жыцця, выходзілі змагацца з немцамі і Петлюрай. Брат ішоў на брата, бацька на сына. Перад узамі класавымі блекнулі і распадаліся узы родственыя. І праз усё гэта чырвонай істужкай праходзіць высокая мара-сімвал сталевара Чубенка аб дружы.

У фільме (сцэнарый В. Паўлоўскага) кнігі, нажаль, не адчуваецца. У інсцэніроўцы літаратурных твораў наша кінематаграфія мае нямалы вопыт. Часта атрымлівалася, што добры твор інсцэніраваўся дрэнна; радзей, што дрэнны твор інсцэніраваўся добра. А часцей за ўсё пры інсцэніроўцы атрымліваўся зусім новы твор, не падобны на сваю крыніцу. Апошняе, на нашу думку, зусім законна і тлумачыцца карэннай розніцай кінематаграфічнага паказу ад славеснага апісання.

Тое-ж самае атрымалася з «Коннікамі». Таму аб фільме «Коннікі» трэба гаварыць не як аб інсцэніроўцы, а як аб самастойным творы.

Фільм «Коннікі» паказвае вызваленчую барацьбу украінскага народа супроць нямецкіх інтэрвентаў. Цэнтральныя вобразы фільма: камандзір партызанскага атрада Чубенка (арт. ордэнаносец Л. Свердлін), матрос Іван Палавец (арт. П. Масоха), селянін Якім Нядоля (арт. С. Шкурат), фельчар (арт. Г. Долгаў) і інш. Як відаць з гэтага кароткага пераліку, у карціне здымаліся артысты таленавітыя, якіх совецкі кіноглядач ведае і любіць на многіх фільмах. Артысты ў большасці іграюць вельмі добра. Асабліва выразна зроблены вобразы Чубенка, Якіма Нядолі, Івана Палаўца.

Сюжэт фільма вельмі займальны. Глядзіцца карціна з цікавасцю. Лёс герояў фільма прымушае гледача хвалявацца. Але калі пасля прагляду фільма запальваецца святло, адчуваеш якоесьці нездаволенне, успамінаеш, што ўсё гэта ты калісьці бачыў.

Тлумачыцца гэта вельмі проста. Наша кінематаграфія зрабіла вельмі шмат фільмаў на тэму партызанскага руху. Гэтым мы не хочам сказаць, што тэма зусім не патрэбная і ад яе прыходзіцца адмаўляцца. Вывад можна зрабіць толькі такі: пры паказе гэтай тэмы трэба шукаць нейкія новыя, дагэтуль нераскрытыя вобразы.

Зусім нядаўна мы захапляюча віталі «Шчорса» Даўжэнка. Фільм гэты заслужыў высокую ацэнку. У «Конніках» ёсць шмат агульнага з «Шчорсам», многія сцэны з «Коннікаў» мы ўжо там бачылі і таму яны нам здаюцца не новымі. Калі-б «Коннікі» паявіліся раней «Шчорса», яны глядзеліся-б з большай цікавасцю.

Хочацца адзначыць удалую музыку фільма (кампазітар С. Патоцкі). Музыка насычана народнымі украінскімі мелодыямі.

«Коннікі»—фільм карысны. Але ўсё-ж ён не зусім задавальняе ўзросшыя густы і патрабаванні совецкага кіногледача.

**А. КУПЕРШТОК.**

## ЗНАЧНЫ ПОСПЕХ ПАЛЕСКАГА ТЭАТРА

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР абвясціла падзяку мастацкаму кіраўніку Палескага тэатра рэжысёру В. В. Пацехіну, мастаку Лук'янаву, дырэктару тэатра Гольдшварцу і ўсяму калектыву за пастаноўку п'есы «Каварства і любоў» Шыллера. Упраўленне адзначыла, што пастаноўка гэтай п'есы—першая работа тэатра над заходняй класікай—з'яўляецца значным творчым поспехам тэатра.

*Ал. СТАНКЕВІЧ*

# „КОМСАМОЛ НА ГРАНІЦЫ“

Комсамольская арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР адзначыла слаўнае 20-годдзе ленінска-сталінскага комсамола зборнікам «Комсамол на граніцы».

У задачу зборніка ўваходзіла адлюстраваць геройчныя будні маладых людзей—комсамольцаў нашай краіны. Але чытач з першых-жа старонак зборніка расчароўваецца. Такія хвалюючыя і адказныя тэмы, як ахова дзяржаўнай граніцы, барацьба з ворагамі, затрыманне шпіёнаў, патрабуюць ад пісьменніка асаблівага майстэрства, бо не такая ўжо простая работа пагранічнікаў, не настолькі бясхітрасны вораг, каб яго так просталінейна маляваць, як гэта робяць некаторыя літаратары. Нарэшце, совецкаму чалавеку, авеянаму славай герою ўласцівы асабістыя пачуцці. А гэтага многія пісьменнікі не заўважаюць.

Бяздушныя літаратары спрабавалі, а некаторыя, пры папусціцельстве рэдакцыйных работнікаў, і зараз спрабуюць абяскровіць сваіх герояў, пазбавіць іх чалавечых пачуццяў, прымусіць іх заўсёды толькі радавацца. Нават паплакаць забаранілі асобныя аўтары сваім героям. А галоўная загана, якая ў большай меры адносіцца да вершаў, гэта — бессюжэтнасць, неканкрэтнасць, лозунговасць. Цяжка ўявіць твор, дзе-б у большай меры праявіўся такі парочны падыход да паэзіі, чым у калектыўнай паэме «Чырвонасцяжны комсамол».

Дарэчы, невядома, чым вытлумачана такая «кліросная» канцоўка «Чырвонасцяжнага комсамола»:

Ноч плыве.
Спяць дзеці у спакоі.
Ясны сон вам, любыя, і мір!

«Мір» устаўлен толькі для таго, каб у рыфме паўтарыць тое-ж слова, але з новай семантыкай — у значэнні «спакой».

З шасці прадстаўленых у зборніку празаічных твораў толькі адзін-два заслугоўваюць увагі чытача.

Асобнае месца займае апавяданне пісьменніка-ордэнаносца Міхася Лынькова «Маладосць». З першых радкоў гэтага твора перад намі ўстае 17-гадовы комсамолец Васька, якому з-за маладосці і сямейных абставін цяжка дабіцца дазволу паехаць на фронт разам з комсамольскай ротай.

Чыстата адносін і пачуццяў да Насці, прастата, бязмежная вера ў перамогу совецкай улады, аптымізм — усё гэта рысы, за якія чытач любіць Ваську.

Восеньскай ноччу, з-за здрады замаскіраваўшагася ворага, белыя неспадзявана напалі на чырвоную часць. У гарачай схватцы храбры кулямётчык Васька з некалькімі таварышамі палажыў жыццё. Ён «прынік непакорнымі віхрамі сваімі да сырой зямлі. Стала ціха-ціха Ваську. Паволі кружыў, падаючы, блеклы ліст з ігрушы. З мяккім шолахам ён кранууўся Васькавай шчакі. Не ўчуў яго Васька... А над полем заміралі стрэлы». Ворага адбілі.

Паралельна з раскрыццём характару Ваські, Міхась Лынькоў рысуе вобраз Насці. Яна ніколі не забудзе простага, вясёлага гарадскога хлопца Ваську. Пазней яна выкрывае правакатара, з-за якога загінулі Васька і яго таварышы. Поўнасцю аддаючыся працы дырэктара буйнай швейнай фабрыкі, Насця заваёўвае аўтарытэт і павагу рабочых і таварышоў. І вось яна — дэпутат Вярхоўнага Совета рэспублікі.

Мова апавядання выразная, даходчывая. Лынькоў ведае людзей і жыццё. Шмат сцэн у апавяданні—надзвычай хвалюючыя.

«Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы» Янкі Маўра, дзе расказваецца аб працы маленькіх чыгуначнікаў, — змястоўнае, лаканічнае апавяданне-нарыс.

Вялікай увагі заслугоўвае паэма маладога паэта Алеся Жаўрука «Гарачы подых». У цёплых, лірычных радках паэмы адчуваецца сапраўдны гарачы подых нашых незвычайных дзён. Першыя радкі паэмы ўводзяць чытача ў абстаноўку ночы:

Пад полагам майскае ночы,
Пад зорамі родных нябёс
Жыты у палях не шапочуць,
Не шасцяць галінкі бяроз.

Гэта выдатна. Без упартай працы аўтара такія радкі не змаглі-б нарадзіцца. І далей:

І толькі ў сакрэтах на варце
Не дрэмлюць сябры ля застаў.
Ды зноў Аляксей Каравацкі
Вядзе свой таварны састаў
Рукою і спрытнай, і вернай,
І колы грымяць яму ў лад:
У тэрмін,
у тэрмін,
у тэрмін...

Некалькі разоў хочацца падкрэсліць апошні радок, — да таго ўсебакова ўдала падабрана алітэрацыя. Знайсці гэта «у тэрмін» для данай сітуацыі ўжо многае значыць. Гэта — паэтычнае майстэрства.

...І ў горадзе ў доміку ветлым,
Так блізкім яму аднаму,
Дзяўчына каханая
Светла
У сне усміхнецца яму...

Сюжэт надзвычай просты, але не гэта галоўнае ў паэме. Філасофія совецкай этыкі — ідэя паэмы — вырашана надзвычай тонка. Выпадковая напасць выбіла справу з гарачых рук комсамольца. Але жыццё не хоча пакідаць юнацкае сэрца. Мозг параненага Аляксея ўвесь час свідруе думка:

...Ты здаўся, прыстаў.
Табе, комсамолец, краінай
Даручана весці састаў.

Аляксеевы пачуцці хвалююць, ім верыш. Пазддаравеў Аляксей, але не вярнулася да да яго ранейшая бадзёрасць і сіла. Гледзячы на юнацкі запал таварышоў, ён адчайваецца. Але:

... Чуе ён голас сяброўскі:
— Вунь кніжка ляжыць на стале.
Ты помніш, як Коля Астроўскі
Змагаўся з бядою?
Але!
Ты помніш, як сам ты на варце
Не здаўся, стаяў да пары.
Дык сцісні-ж ты рукі упарцей,
Юнацкія сілы збяры.
...Гардзіся, што справа ідзе,
Што мяч
Твой сапернік калішні
Выдатна па полю вядзе.

Так раскрываецца характар. І сапраўды, такія аргументацыі і сродкі здольны знішчыць адчай юнака, вырванага з строю жыццёвай барацьбы.

Сапраўды паэтычнай мовай напісаў Алесь Жаўрук паэму «Гарачы подых».

Вызначаецца арыгінальнасцю і цеплынёй «Песня аб поясе» М. Клімковіча. Не гледзячы на неранетасць тэмы, верш маладога паэта Аркадзія Гейне «Шчаслівая зорка» цікавы і своеасаблівы. Вельмі ўдаліся «Дажынкі» маладому беларускаму паэту-песенніку Адаму Русаку. Выразная, вельмі блізкая да фальклору мова, лёгкая напеўнасць характарызуюць «Дажынкі» Русака.

Але ёсць і ў гэтым творы вельмі нязграбныя радкі:

Пастараемся-ж мы
Для сябе надзвычай (?!).
Каб на той год у нас быў...

Неабходна заўважыць, што ў песнях Русака (а ў гэтай галіне ён спецыялізіруецца) вырысоўваецца дрэнная рыса: рытарычныя сродкі паказу быту і рэчаіснасці, неканкрэтнасць.

Што-ж можна сказаць аб астатніх вершах, змешчаных у зборніку? У «Прызыўной песні» Х. Мальцінскага ёсць такія радкі:

«Праверыўшы (!) старанна слых,
І мускулы, і вочы,
Мне доктар ветліва кіўнуў (?):
— Як дуб ты моцны, хлопча».

Ды гэта-ж разбітая на радкі проза, а не песня! Не гледзячы на абсалютную непаэтычнасць і адсутнасць нават рыфмы («слых» і «кіўнуў» ніяк не могуць рыфмавацца), аўтар спрабуе ўверыць чытача, што гэта песня.

Захапіўшыся метафарычнасцю, Г. Нягай у вершы «Гаспадар» канстатыруе:

Спяшаць калгаснікі: работа
Іх цешыць поўнымі **грудзьмі** (!?).

А вось «Песня трактарыста» Карагі. Ніводнага арыгінальнага і трапнага вобраза, ніводнай свежай рыфмы. Карага ў гэтай «песні», напрыклад, рыфмуе: ноч — руль, гудзе—плю, вяду—танк, зараз—араць. Якім прымітывам і пылам векаўшчыны аддае ад такіх радкоў:

**Я старанна ару**
**І жаданнем гару.**

А ў «Жніве» гэтага-ж аўтара: «Дзве песні крылатых...», альбо: «Я так-жа **заўзята спяваю** і жну»... Аўтар, мабыць, не ведае, што **заўзята** жаць і адначасова **заўзята спяваць** — цяжка.

Нічым асаблівым не вызначаюцца празаічныя зарысоўкі Ів. Шапавалава і М. Бічэўскага. Узятая гэтымі аўтарамі тэма — ахова дзяржаўнай граніцы і барацьба з няпрошанымі гасцямі — не атрымала належнага вырашэння. Чытачу надзвычай непрыемна бачыць такое спрашчэнне рэчаіснасці, і ён з першых-жа радкоў перастае верыць таму, што гавораць аўтары, (падкрэсліваю, «гавораць», а не паказваюць). Сухая канцылярска-інфармацыйная мова, надзвычай далёкая ад мастацкага слова, адсутнасць вобразаў характарызуюць гэтыя творыкі.

Шапавалаў у «Папцы аб узнагародах» піша: «Адкрываеш папку і здаецца, што чуеш пах... прэлых лісцяў...» Гэта, так сказаць, для вобразнасці. І прадаўжае: «Чуеш шэлест і трэск сукоў пад нагою ворага, чуеш прыслушаны, але рашучы воклік «стой» і бачыш зеленавата-жоўтае полымя выстралаў у начной цемры». Гэта шчырасць аўтара, бо ён раскрыў схему, якой ён і яго сабраты па такой літаратуры прытрымліваюцца. «Што за бяда, што ворагаў пяцёра, а іх (пагранічнікаў—**А. С.**) двое?» — усклікае Шапавалаў у адным з апавяданняў. З боку пагранічнікаў «чуецца шэпт: — Стой!— Збянтэжаныя парушальнікі (іх пяць!— **А. С.**) падымаюць рукі». Вось і ўсё. Аказваецца, з узброенымі да зубоў парушальнікамі граніцы нават зусім не цяжка ўправіцца!

Просталінейнасць і павярхоўнасць, надзвычайная моўная беднасць, абыякавыя, напляваце́льскія адносіны да адказных тэм, прызваных фарміраваць ідэалогію мас, надзвычайная прастата і наіўнасць раскрыцця характараў і паказу жыцця,—усё гэта літаратура, якая нічым не ўзбагачае чытача, не выклікае вялікага пачуцця і хвалявання, не мае пазнавальнага значэння.

А мастацкая літаратура тым і спецыфічна, што праз яе чытачу раскрываюцца новыя гарызонты складанага, шматграннага жыцця.

# ЗАМЕТКІ АБ ПАЭЗІІ З. БЯДУЛІ

Я. ГЕРЦОВІЧ

★

I.

У змрочныя і сумныя годы сталыпінскай рэакцыі каваў Змітрок Бядуля «на горне душы» свае першыя вершы-песні. Малады ў той час паэт бачыў, што «злыя чары апаганілі ўвесь край», ён глядзеў на гарады, мястэчкі, сёлы Беларусі і ўсёй Расіі і на кожным кроку адчуваў «анямеласць галечы і смерці», адчуваў, як «вакол шыі вяроўка пляцецца». Паэт любіў сваю Беларусь, жадаў шчасця народу, марыў аб тых днях, «калі настане ранне для ўсёй краіны». Але неспрактыкаваны ў класавых баях, не загартаваўшы сваю ліру, падобна Купале і Коласу, у грымотных агнях рэвалюцыі 1905 года Змітрок Бядуля доўгі час не ведаў, «з кім змагацца, для каго на гуслях граці».

Не адзін толькі Змітрок Бядуля стаяў на раздарожжы ў гэтыя годы, не толькі на яго творчасці так балюча адбіліся пошукі шляхоў вызвалення народа з-пад гнёту чорнай рэакцыі. Найменш устойлівыя пісьменнікі цягнулі рускую літаратуру к бульварным, парнаграфічным раманам, к услаўленню цёмных інстынктаў так званай моцнай асобы. Індывідуаліст і мярзотнік Санін з аднайменага рамана Арцыбашава стаў ідэалам для той часткі інтэлігенцыі, якая назаўсёды адышла ад рэвалюцыі пасля паражэння пролетарыята ў 1905 годзе. Мяшчанскія клікушы ад літаратуры альбо звалі чытача замкнуцца ў сваіх асабістых перажываннях, альбо пужалі яго ўсялякімі жахамі, як гэта рабіў Леанід Андрэеў. Усталялі, не паддаліся гэтым настроям толькі тыя з пісьменнікаў, якія былі блізка звязаны з рабочым класам, з большэвіцкай партыяй. Гэта быў Максім Горкі, які напісаў якраз у гэтыя часы свой выдатны, поўны веры ў перамогу пролетарыята раман «Маці». Гэта былі нямногія з інтэлігентаў, якія разам з большэвіцкай партыяй і пад яе кіраўніцтвам работалі на рэвалюцыю і не пакідалі веры ў яе хуткі прыход.

Сказаўся разлагаючы ўплыў сталыпінскай рэакцыі і на беларускай літаратуры. Нават у творчасці лепшых беларускіх паэтаў — Купалы і Коласа — сталі прарывацца ноткі адчаю і разгубленасці, мацней загучэлі матывы жальбы і суму. Але моцная сувязь з народам, любоў да працоўнага чалавека дапамаглі Купалу і Коласу стаць выразіцелямі дум беларускага народа. Гэта самае можна сказаць і аб Змітраку Бядулі.

Цяпер ясна, чаму ў ранніх вершах Бядулі так многа роспачы і суму, так многа скарг на цяжкі і суровы лёс. «Дзверы ўсе зачынены, куды ісці, куды?» — пісаў паэт у 1910 годзе. Дзесяткі разоў ставіў Бядуля адны і тыя-ж пытанні: «Што рабіць? Дзе дзецца мне?», «Ці да шчасця зачынены дзверы і дзверцы?» Часны мастак, гуманіст у лепшым сэнсе гэтага слова, Змітрок Бядуля разумеў, што яму не па шляху з тымі спевакамі, «што вучаць, як гнуцца над панскім ярмом». Але ён не разумеў, што з гэтага трэба рабіць нейкія станоўчыя вывады, што доўгі час заставацца на пазіцыях пасіўнага спачування народнаму гору нельга. Гэта Змітрок Бядуля ўсвядоміў значна пазней, і тады ён больш не пакутаваў над праблемай: «з кім змагацца, для каго на гуслях граці?».

Калі намаляваць лінію творчага развіцця Змітрака Бядулі, то лінія гэта будзе надзвычай няроўнай і звілістай, хаця яна і будзе безупынна ўзнімацца ўгору.

У першых сваіх вершах паэт, галоўным чынам, апісваў прыроду. Раніцой, калі пахне «сняданнем і дымком над вёскай», ён прачынаўся «ад плачу птушкі невядомай» і глядзеў вакол сябе шырока раскрытымі ад здзіўлення вачыма. Запалонены песняй зямлі, яе гукамі і фарбамі, паэт увесь аддаваўся сузіранню характва «рубінавага ўсходу» у свежую летнюю раніцу, зыбання рэчкі «між абоймаў цёмных волх», красы асрэбраных месяцам палян. Песняр ішоў часта ў сыр-бор, каб там «гаіць раны душы».

Палі і сенажаці, быстрацечныя рэкі і непраходныя пушчы Беларусі з кожным разам адкрывалі перад паэтам усё больш захапляючыя сваёй прыгажосцю і гармоніяй карціны і з'явы, ад якіх мастак не мог адарвацца. Улетку «бярэзнік на пагорку беліць шоўк», «раса прылятла да зямлі», песціць вуха «чулы летні шэпт расістых каласоў». Узімку «хвоі ў белых хвастах з гарнастаю... стаяць як макеты». Вясною на гэтым самым месцы «ручай звініць дукатам», хлопчык абдымае бярозку і «п'е салодкі сакавік», авечкі слухаюць «веснавыя званочкі» салаўя. Паэт убіраў у сябе гэтыя ўражанні і рабіўся «братам бяроз, ручаёў, матылькоў, кволых кветак».

Ніхто ў беларускай літаратуры не ўмеее так ярка і маляўніча апісваць з'явы прыроды, як Змітрок Бядуля. Бядуля здольны дзесяткі разоў маляваць адзін і той-жа пейзаж, апісваць адну і тую-ж з'яву прыроды і кожны раз знаходзіць новыя дэталі, новыя фарбы, новыя мастацкія сродкі. Адзін раз месяц «на лугу сее зёрны серабра», у другі раз у такі самы вечар «хтосьці ўночы кінуў рыбкам з неба срэбраны гарох». У адным вершы «згубіла зарніца чырвоную хустку на начным вясёлым гулянні», у другім вершы «зарніцы гарэлі над рэчкай... чырвань кідалі ў бяздонне, квітнелі». Потым «зарніцы пагаслі, сінявілі змрокі і зоркі пусціліся ў скокі». Паэту даступна і тое, чаго не прыкмячае звычайнае вока. Ён адчувае і бачыць, як «душыцца дзень пад дзяругамі хмар», як «вецер доіць малако са страх», «змрокі цэдзяцца праз вокны», альбо як «зазімак сыпле мукою на рынак».

Праўда, ёсць у гэтых вершах і вялікі мінус. У Купалы і Коласа прырода і чалавек заўсёды складаюць адно цэлае. Поле ў іх нямысліма без ратая, які на ім працуе. Любуючыся збожжам, яны ў сваіх дарэвалюцыйных песнях не забываліся аб тым, што ўраджай дастанецца не ратаю, а пану. У Купалы і Коласа пейзаж заўсёды грае падсобную ролю, ён скарыстоўваецца імі, каб лепш ахарактарызаваць тую ці іншую праяву жыцця, лепш акрэсліць паэўную думку. Бядуля ў сваіх ранніх вершах часцей за ўсё застаецца з прыродай сам-на-сам. Ён галоўным чынам скарыстоўвае пейзаж, і скарыстоўвае вельмі ўмела, для перадачы сваіх асабістых перажыванняў.

Тут-жа скажам, што ў гэты час Бядуля не толькі назіраў прыроду. Ужо ў 1910 годзе паэт бачыў, як «бедны рабочы — скалечан машынай, пры ёй здабываў ён крывавы пятак», з болем у сэрцы наглядаў, як «з агідай кідаюць галоднаму кесць» так званыя дабрадзеі-філантропы.

Дарэмна многія з тых крытыкаў і рэцэнзентаў, якія пісалі аб Бядулі, штучна разбівалі яго творчасць на цвёрда акрэсленыя перыяды, кожны з якіх меў сваю пераважную тэматыку. Даказвалі, быццам Бядуля спачатку быў эстэтам, потым у яго паявіліся грамадскія матывы. Гэта далёка не так. Пошукі свайго месца ў барацьбе беларускага народа за вызваленне вяліся паэтам увесь час. Спачатку яму здавалася, што перабудаваць свет заклікана мастацтва, што правадырамі народа могуць быць толькі песняры. Песні гусляра, калі яны «гукаюць да смелых учынкаў», думаў паэт, здольны выклікаць «полымя-пажар». Нават многа год пазней, у няскончанай паэме «Ярыла», Бядуля пісаў:

Словы песні гэтай смелай
З неба падаюць, як стрэлы,
І трапляюць простым людзям
Песні-стрэлы ў сэрцы, ў грудзі.
Люд збіраецца ў мяцежы
І на пана праўду рэжа.
Адкідае забабоны,
Кліча сходкі люд прыгонны.
Ён пускаецца ў дарогу
Супраць пана, супраць бога.

Прыгадаем вядомую паэму Якуба Коласа «Сымон музыка», прыгадаем верш Купалы «Скрыпка» і інш.—і нам стане зразумела, што роля, якую Бядуля адводзіў песнярам, была поўнай данінай настроям, панаваўшым ва ўсёй беларускай літаратуры таго часу. Але гэты настрой яшчэ раз сведчыць, што Бядуля чакаў рэвалюцыю, хоць не разумеў яе рухаючых сіл і шляхоў развіцця. У 1914 годзе, у вершы «Пан», Змітрок Бядуля кідае кліч «Ты пана бі і вырві волю». У гэтым-жа годзе паэт з вялікай мастацкай сілай і тэмпераментам апявае мяцежніка ў такіх словах:

Я—волю з жалезных клыкоў вырываю!
Я—гнеў гарапашных!
Я— злосць агнявая!
Я—помста
За здзекі,
За кроў,
За шмат слёз!

Свайго мяцежніка Бядуля называе толькі «марай адважных людзей». Адважны змагар гіне, прападае і «не вернецца смелы ніколі». Адарваны ўмовамі свайго жыцця ад рабочага руху паэт тады не разумеў, што рэвалюцыя мае свае законы, што ні адно выступленне рэвалюцыйных сіл не прападае дарэмна. Іменна пагэтаму рэвалюцыйна-дэмакратычныя настроі і тэндэнцыі паэта насілі такі расплывучаты, абстрактны характар.

Імперыялістычная вайна 1914 года яшчэ больш ускрыла і моцныя і слабыя бакі творчасці Змітрака Бядулі. Паэт ніколі не быў пацыфістам, ён не лічыў вайну фатальнай непазбежнасцю, не апраўдваў яе:

Не мы захацелі
Крывавай забавы,—
А дзікая зграя...
Не мы вінаваты,
Што кроў пацякла,
Не мы вінаваты,
Што гібель прышла.

Ні ў адным з сваіх вершаў не выказаўся Бядуля за перамогу «рускай зброі», бо разумеў грабежніцкую, імперыялістычную сутнасць царскай арміі. Адсюль яшчэ, праўда, далёка да большэвіцкай лініі на паражэнне царскага ўрада і ператварэнне імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Але важна, што паэт ні на хвіліну не паддаўся шавіністычнаму чаду, што ён рашуча асудзіў вайну.

Ёсць у Змітрака Бядулі хвалюючы прыгожы верш, у якім паказваецца, што мірнае насельніцтва не лічыла «сваю» рускую армію абаронцай народных інтарэсаў. Варта было быць яўрэем, каб ператварыцца для кіраўнікоў гэтай арміі ў «нутранога ворага». Не дзіва, што працоўныя яўрэі (і не толькі яўрэі) перад прыходам царскіх войск вымушаны былі хаваць свае бэбахі. «Чым мы вінаваты?» — пакутліва дапытваюцца не толькі дарослыя, але і дзеці. Незабыўнае ўражанне пакідаюць развагі 5-гадовай дзяўчынкі Соні аб вайне, яўрэйскіх пагромах.

Усе гэтыя вершы нашай крытыкай яшчэ не даследаваны і патрабуюць вывучэння. Але бясспрэчна адно: паэтычная творчасць Бядулі рухала ўперад беларускую літаратуру з такой самай сілай, як і яго проза. Можна гаварыць аб асобных не зусім сугучных і зразумелых нашаму чытачу матывах, можна папракаць паэта за тое, што ён часам больш думаў аб вобразнай нагрузцы радка, чым аб яго ідэйнай накіраванасці. Знайшліся, нажаль, крытыкі, якія прыкмецілі толькі гэты бок справы і прайшлі міма прычын, парадзіўшых гэты недахоп у творчасці Бядулі. Нам вядомы крытыкі, якія разважаюць прыкладна так: Перад намі выдатны пісьменнік. Ён блізкі да народа, піша ўдалыя вершы і апавяданні. Але трапіў гэты добры чалавек у асяроддзе «нашаніўцаў», звязаўся з усякага роду «адраджэннямі» і ў яго сталі прарывацца нацыяналістычныя ноткі. Потым гэты пісьменнік схамянуўся, перагледзеў свае пазіцыі і вярнуўся да сваёй першабытнай сутнасці. І яго творчасць «набыла новую якасць».

Такі суб'ектыўны падыход да творчасці пісьменніка нікому не дае карысці. Творчасць кожнага мастака не можа развівацца ізаліравана ад гістарычных умоў развіцця грамадства. Гісторыя літаратуры яшчэ не ведала мастакоў, якія сталі-б «поверх барьера» у барацьбе класаў. І ўжо ва ўсякім выпадку не стаяў «поверх барьера» Змітрок Бядуля. Яго дарэвалюцыйная творчасць — гэта своеасаблівая гісторыя перадавой беларускай інтэлігенцыі ў перыяд сталыпінскай рэакцыі і імперыялістычнай вайны.

II

Пасля рэвалюцыі і грамадзянскай вайны Змітрок Бядуля адчуў сябе «кропляй вялікага творчага мора»,—калектыва, які будуе соцыялізм, і паэзія яго ўзбагацілася новымі тэмамі і матывамі, новымі мастацкімі фарбамі. Ён ўсхвалявана піша аб тым, як рабочыя і сяляне чысцілі след ворага «вяхоткаю сталёвай», як беглі з Беларусі пад націскам Чырвонай Арміі паны і на карку ў іх з страху лой дрыжэў». Паэт удала параўноўвае старое — з асеннім гнілішчам, адыходзячае — з густымі, гнілымі туманамі, а народжанае, новае — з гордым сокалам.

Праўда, не ўсё напісанае Бядуляй аб грамадзянскай вайне мае аднолькавую мастацкую вартасць. У прыватнасці, у «сказах буры і віхораў» не ўдаўся паэту вобраз партызана Янкі Віхрабурнага. У Віхрабурнага і яго таварышоў, ва ўсіх гэтых хлопцаў «з зоркай на шаломах, з бурай вольніцы ў грудзях», ёсць штосьці ад выведзенага Бядуляй ў 1914 годзе мяцежніка, які злаваўся, хмялеў, загараўся, збіраўся кінуць «сусветнасць у пажары» і ў той час быў толькі «марай адважных людзей».

Жыццёвы шлях Віхрабурнага, якога паэт называе «байкарам вольніцы», — вельмі просты. Спачатку ён пастушокпарабак, па вушы закаханы ў прыгожую панскую дачку Марыну. Аднойчы паненка нанесла хлопцу вялікую абразу—яна абазвала яго «хамам», «быдлам». Янка ўцёк у горад, каб там «загасіць агонь пякельнага кахання». У горадзе Янка стаў рабочым-ліцейшчыкам і «выведаў на сваіх плячах, адкуль бярэцца ліха». У часе белапольскай акупацыі ён вярнуўся ў вёску і стаў арганізатарам партызанскага руху, атаманам паўстанцаў, якія палявалі «жаўнераў панскіх, нібы качак». Панскі падліза Лявон, родны брат Янкі Віхрабурнага, вынюхаў, дзе знаходзяцца партызаны, і прывёў у лес атрад польскіх жаўнераў. З Янкавых вачэй бліснулі «маланкі дзве блакітныя», і ён загадаў застрэліць Лявона. Потым партызаны ў бойцы з палякамі забіваюць пана Скрыцкага. Янка сустракае Марыну, калі яна, «белая, як снег, плача, убіваецца» над трупам свайго бацькі. Віхрабурны на момант забыў, што ён нядаўна «пракляў сваё каханне да панскай дачкі». Але варта было паненцы халодна паглядзець на атамана, як у яго руках «бліснуў рэвальвер». Усё гэта паказана вельмі спрошчана, прасталінейна. Янка больш падобны на плакатнага героя, чым на жывога чалавека.

Нават там, дзе патрэбна чотка акрэсленая лінія, дзе асабліва важна паказаць унутраны свет герояў, Бядуля ў абмалёўцы партызанаў карыстаецца лезь прыкметным пункцірам. Мы не бачым перад сабой жывых паўстанцаў, кожны з якіх надзелен адному яму ўласцівым характарам. Замест гэтага мы маем справу з людзьмі, у якіх «сківіцы, бы абцугі», «цела — сталёвая спружына».

Многа ўвагі аддае Бядуля мінуламу. Таленавіты мастак імкнецца хутчэй «забыць сляды стагоддзяў, пад спевы яркіх дзён забыць жуду гразі». Але скінуць з плеч цяжар успамінаў аб вяках нядолі і пакут народа Бядулю не ўдаецца, і раз за разам уваскрашае ў сваіх творах пісьменнік поўныя жуласці карціны з жыцця дарэвалюцыйнай беларускай вёскі. Так паявілася ў Бядулі аповесць «Салавей», так паявіўся ў яго цыкл вершаваных апавяданняў аб днях, якія ніколі больш не вернуцца.

Нельга без вялікага хвалявання чытаць вершаваныя апавяданні «Адплата пану» і «Госць». На апавяданні «Госць» мы крыху спынімся.

Надвячорак. «Туман носіцца ў даліне, змоўкла птушка на галіне, гарыць шапка на сасонцы»... У гэты час «пад касагорам шэсь крочыць крокам скорым падарожнік адзінокі».

...Поўнач. «Туман коціцца ў даліне, птушка дрэмле на галіне. Зоркі — кроплі на паперцы... Блізка мыш скрабе па сценцы, кот пікуе на паленцы». У гэты час падарожнік спіць у хаце сваіх бацькоў і не ведае, што старыя ціха, спрытна точаць нож, каб зарэзаць і абрабаваць сына, якога яны не спазналі. Хмельны пах грошай так завабіў старога, што ён у думках апраўдвае сваё зладзейства клопатам аб спадчыне для сына: «Вось сыночак мой Ягорка недзе ў людзях жыве горка... Я гатоў пайсці на грэх... для сынка спрабую... Эх!..» А сын, Ягор, хацеў пажартаваць і чакаў, пакуль раніцай яго пазнаюць бацькі...

...Раніца. «Туман пікне на даліне, пяе птушка на галіне. Грае сонца на усходзе: пясок свежы на гародзе».

«...Туман згінуў у даліне. Пяе птушка на галіне, глядзіць сонца дабрадзеем. Лес шапоча: знаю дзе ён!». Сыплюць пэрлам роскі ночкі: «Во слядочкі! Во слядочкі!»

Мы знарок так падрабязна спыніліся на гэтым апавяданні, каб паказаць, з якім вялікім майстэрствам Бядуля ўмее паказваць унутраны свет герояў мінулага, з якой сілай ён карыстаецца пейзажам для перадачы самых тонкіх і неўлавімых перажыванняў людзей, для абмалёўкі іх душэўнага стану ў складаных, у крытычных сітуацыях.

Бядуля і ў прозе і ў вершах, бадай, як ніхто другі ў беларускай літаратуры, ўмее карыстацца дэталлю, пэмушань яе ззяць усімі адценкамі фарбаў. У вершаваным апавяданні «Дзед» паэт задаецца мэтай паказаць, наколькі жывучы ў свядомасці людзей перажыткі і звычкі мінулага. Вырашаецца тэма праз вельмі трапную і яркую дэталь: дзед пры савецкай уладзе ўзбіўся на такую-сякую гаспадарку і стаў знімаць дастатковы для ўтрымання сям'і ўраджай. Але ён лічыць, што без мякіны і адзкаў не будзе ніякай ашчады і хлеб нават «страціць свой смак». У паэме «Чырвона-чорная жалоба» Бядуля паказвае любоў беларускага народа да Леніна праз адну дэталь, якая гаворыць больш, чым сотні радкоў у некаторых іншых паэтаў. Калі стала вядома аб смерці Леніна, «беларуская кабета ад прастаты і шчырасці сваёй галашэнне дзядоўскае заводзіць: — «На каго-ж ты нас пакінуў, ой, татуленька! Асіранелі без цябе мы, ой, зязюленька!»

Шкада, вельмі шкада, што паэт многа год не пісаў вершаў. Савецкі чытач, высока цэнячы прозу Змітрака Бядулі, управе чакаць ад яго таксама высокамастацкіх паэм, вершаў, вершаваных апавяданняў. Змітрок Бядуля — адзін з самых лепшых, самых арыгінальных і цікавых паэтаў Савецкай Беларусі. На яго паэзіі вучацца і будуць вучыцца маладыя кадры беларускай літаратуры.

НОВЫЯ ЧЛЕНЫ ССП БССР

# ПАЭТ-ПЕСЕННІК



А. Русак.

Шмат хто з нашых паэтаў можа шчыра пазайздросціць Адасю Русаку. Яго песня «Бывайце здаровы» абыйшла ўвесь Совецкі Саюз, увайшла ў фонд лепшых песень, блізкіх народу па свайму зместу, пачуццях, па сваёй яркай паэтычнай форме. Варта ўспомніць, што твор «Бывайце здаровы» звярнуў на сябе ўвагу і совецкай паэзіі, што нашы паэты ўбачылі ў ім узор народнай песні.

На першы погляд магло здацца, што поспех залежыць проста ад шчаслівага выпадку. Аднак, лёгка пераканацца ў адваротным, калі глыбей унікнуць у творчасць Русака.

Песні, надрукаваныя ў газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», у журнале «Полымя Рэволюцыі», новыя песні, напісаныя Русаком за апошні час асабліва паэма «Вяселле», сведчаць, што перад намі самабытны паэт-песеннік, глыбока пранікнуўшы ў народную творчасць, арганічна звязаны з сучасным беларускім фальклорам.

Русак не стылізуе народнай песні. Ён настойліва павышае яе паэтычную якасць. Песні Русака выклікаюць цікавасць да фальклору, імкненне авалодаць той мастацкай прастатой, якая робіць твор найбольш зразумелым народу.

Не бяруся даводзіць, але мяркую, што з'яўленню цудоўнай паэмы Аркадзя Куляшова «У зялёнай дуброве» дала штуршок, садзейнічала песня «Бывайце здаровы». Справа, вядома, не ў тым, што Куляшоў узяў для паэмы рытмічны памер гэтай вядомай песні, а ў тым, што паэт убачыў у песні Русака новыя мастацкія якасці. Яго ўвагу прыцягнула паэтычная празрыстасць зместу, свежасць, навізна пачуцця. І сапраўднага паэтычнага эфекту дасягнуў Куляшоў таму, што ён не пераймаў, не стылізаваў народнай творчасці, а паэтычна асэнсоўваў самую яе мастацкую сутнасць.

Тав. Русак з'яўляецца адным з тых дараванняў, якія ўваходзяць у літаратуру як лепшыя тварцы фальклору. Свежасць песень Русака заключаецца ў тым, што ён убірае ў сябе ўвесь паэтычны арамат народнай паэзіі непасрэдна з яе жывых крыніц, а не ўспрымае яе праз гатовую літаратурную трансфармацыю, як робяць гэта тыя, хто любіць пахваліцца народнасцю, а то проста схавацца за гэты выратаваўчы тэрмін для апраўдання ўбоства свайго творчага вымышлення.

Найбольш Русаку ўдаюцца павіншавальныя і застольныя вершы, у якіх аўтар выступае заўсёды не толькі як вясёлы песеннік, але як роўны з усімі ўдзельнік свята, падзеі. Жывая размова са слухачом, задушэўнасць, жартаўлівасць, ледзь прыкметная ўсмешка — усё гэта вызначае песні Русака, адрознівае іх ад мноства аднастайных, падобных адзін на другога, сучасных песенных тэкстаў.

Падзеі паэмы «Вяселля» Русак бачыць вачыма вясковага музыканта, заўсёдатая веселосці:

Невялікі талент маю,
Ужо з прыроды я такі,
Змалку я на скрыпцы граю,
Больш нішто мне не з рукі.

Змалку Русак іграе на скрыпцы, змалку ён ходзіць па людзях. Шмат перайграў ён вяселляў, вечарынак, шмат праспяваў, праслухаў песень. Яму вядомы ўсе вясельныя звычаі:

Без мяне сумуюць госці,
І ўсё гэта нездарма,
Бо ў вяселлі весялосці
Без мяне нідзе няма.

У паэме аўтар расказвае моладзі пра старое вяселле, прыводзіць вельмі трапныя эпізоды, якія малююць ідыятызм старой вёскі, якія паказваюць вяселле—гэтую рашаючую падзею ў жыцці чалавека — часта як акт хітрай здзелкі, грубага насілля над воляй, над пачуццямі. Але не паказ чорнага мінулага займае паэта. Ён успамінае аб ім, каб яскравей, выразней, паўней перадаць радасць сучаснага жыцця, паказаць новыя разуменні, узаемаадносіны і пачуцці людзей соцыялістычнай эпохі, людзей, разам з якімі весяліцца песеннік і музыкант, разам з якім ён славіць вялікага Сталіна.

Хто ты, веліч высокая,
Не зраўняць цябе з зорамі.
Хто ты сіла магутная —
Не зраўняць цябе з громамі.
Будзь табе слава вечная,
Мудры наш правадыр!
Ты не сонца, а свеціш нам,
Не агонь ты, а грэеш нас.
І не ветрам, а ласкаю
Наша сэрца авеяна.
Будзь табе слава вечная,
Мудры наш правадыр!

Паэма «Вяселле» вызначаецца яркай вобразнасцю, песеннасцю. Песні «Бадай таму свату» і «Неспадзеўкі дзіця ў дзеўкі» паказваюць, што Русак дасканала валодае жывой народнай мовай, глыбока разумее паэтычны вобраз. І такіх песень, якія ўвойдуць у народную творчасць, стануць лепшымі ўзорамі фальклору, — у Русака шмат.

З лёгкай рукі некаторых «спецыялістаў» у нас прывіваецца ўяўленне аб народнай творчасці, як аб занятку, лёгка даступным усім і кожнаму. У газетах, асабліва раённых, часта друкуюцца жаласліва непісьменныя частушкі, нічога агульнага не маючыя з фальклорам. Пачынае ўзаконьвацца безыменная халтура, а нашы «фальклорысты» замест таго, каб любоўна збіраць і папулярызаваць лепшыя паэтычныя ўзоры, створаныя народам, яго сапраўднымі талентамі, падсоўваюць чытачу, выдаюць за фальклор прыкрыя шпаргалкі.

Трэба жорстка асудзіць падобную практыку, бо яна дыскрэдытыруе сучасны фальклор, шкодзіць росквіту сапраўднай народнай паэзіі. Мы павінны збіраць, вывучаць і прапагандыраваць самае перадавое, самае лепшае, што ўяўляе мастацкую вартасць, а не тое, што трапіцца пад руку. Трэба акружыць увагай людзей, якія нясуць у скарбніцу совецкай культуры багацці слова, залатыя россыпы народнай творчасці. Прыклад такой клапатлівасці і ўвагі паказаў наш урад, які разам з выдатнымі майстрамі слова адзначыў высокімі ўзнагародамі лепшых народных песняроў і казачнікаў.

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР, які днямі прыняў тав. Русака ў сваю сям'ю, павінен дапамагчы маладому паэту ў яго плённай творчай працы. Многія песні Русака яшчэ вельмі прымітыўныя па сваёй тэхніцы, паэт карыстаецца пераважна дзеяслоўнай рыфмай, не ўсюды дабіваецца музыкальнасці, лёгкага рытмічнага гучання сваіх песень. Неабходна яшчэ адзначыць, што некаторым песням Русака ўласціва наіўнае ўяўленне аб калгаснай заможнасці. Паэт бачыць яе пераважна ў сытасці. У застольных песнях Русака настолькі поўна «снедзі» і «яствоў», што ўсхваленню ўсяго гэтага «земного изобилия» маглі-б пазайздросціць нават фламандскія жывапісцы.

Цім. КРЫСЬКО.

А. РУСАК

# ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

## 1. СТАРАЯ

Бадай таму свату
Ды вылезлі вочы.
Як ён мяне сватаў
Не ўдзень, ды ўночы.
Бадай яму ногі
Скрышыла, зламала,
Як я маладою
Ды гора пазнала.
Ці дома я, мамка,
Табе дакучала, —
Навошта ты замуж
Мяне аддавала?
Ці я табе, мамка,
Не наравіла,
Ці я табе, мамка,
Кашулі не мыла?
Здаецца, я, мамка,
Ніколі не плачу,

А выйду на вуліцу —
Свету не бачу.
Здаецца, я, мамка,
Не цяжка працую,
У руках маладых-жа
Ужо сілы не чую.
Як выйду я з хаты —
Ад ветру хілюся.
Як выйду я ў поле —
Слязамі заллюся.
Нашто-ж мне чужое
Багацце дарыла,
Калі ў горкай долі
Жыццё мне не міла?
Нашто-ж было, мамка,
На свет нараджаці,
Калі не сумела
Ты шчасця мне даці?

## 2. НОВАЯ

Неўспадзеўкі
Дзіця ў дзеўкі,
Як кветка вясною,
Негадана,
Нечакана
Расцвіла красою.
А клапотаў,
А турботаў
Ды было не мала
Роднай маці
Для дзіцяці,
Покі ўзгадавала.
А дзяўчына,
Як птушына,
Толькі апярэла —
Распакрыла
Свае крылы —
Фыр — і паляцела.

Шкода бацьку,
Шкода матку
Дзеўцы пакідаці,
Ды, вядома,
Век-жа дома,
Ёй не векаваці.
Дзе пазнюся
Я, мамуся,
Не пытай нікога:
Спадабала,
Пакахала
Хлопца маладога.
Спадабала,
Пакахала,
Ды ніхто не знае,
Што я ночкі
У садочку
З мілым каратаю.

# МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ БССР НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

Надзвычайны выгляд меў у гэты дзень Парк культуры і адпачынку. На пляцоўцы каля будынка кінотэатра рад за радам пастроіліся вежавыя вышкі, на якіх расцягнулася шырокае блакітнае палатно. З бакоў высунуліся велізарныя сцены, распісаныя беларускім арнаментам. На самой пляцоўцы раскінуліся пні і дубкі.

З-пад горкі адна за другой паяўляюцца групы калгаснікаў у красачных, яркіх нацыянальных беларускіх касцюмах, сярод калгаснікаў — баяністы, гарманісты, скрыпачы, дудары, жалеечнікі і цымбалісты.

Адзін з калгаснікаў вітае сталіцу вялікага Совецкага Саюза — чырвоную Маскву. На першым плане пляцоўкі весела гуляюць дзеці. Вось да іх падыходзіць стары калгаснік. Дзеці абкружаюць яго і просяць расказаць казку. Дзед ахвотна згаджаецца. Мудра расказвае ён аб чалавеку-сонцы Леніне і аб яго таварышу і другу вялікім Сталіне.

На пляцоўцы ўсё новыя і новыя групы калгаснікаў — з Прапойска, Шклова, Юравіч, Хойнікаў, Рэчыцы, Цімкавіч, Асіповіч, Слуцка. Яны спяваюць, танцуюць. Тут і старажытная песня беларускага народа, выдатныя танцы, тут і новыя песні і частушкі аб правадыру народаў таварышу Сталіне, аб маршалу Варашылаве, аб заможным, радасным, шчаслівым калгасным жыцці. Нельга без хвалявання слухаць песні «Лён», «Ой, зелена, зелена», якія выконваюцца харавым калектывам калгасаў «Ударнік» і «Чырвоны сцяг» Палескай вобласці, «Як крыніца цячэ» — рэчыцкім хорам, «Вярба», «Ах ты, сад мой» — харавым ансамблем Прапойскага раёна, «Вішанька» — хорам Шклоўскага раёна, жартаўлівыя калгасныя частушкі і частушкі аб Сталіне. Цікава было глядзець малавядомыя пляскі «Шостак» і «Мікіта» у выкананні танцавальнага калектыва Асіповіцкага раёна, вытворчы танец «Лянок» і кадрыль у выкананні танцавальнай групы Хойніцкага і Рэчыцкага раёнаў, папулярныя танцы «Лявоніха» і «Мяцеліца» у выкананні зводнай танцавальнай групы ўсіх удзельнікаў, калі пляшуць літаральна ўсе, ад старога да малога, і т. д.

З вялікім настроем і выразнасцю былі выкананы зводным хорам працяглая песня «Ой, у лузе, лузе» і з задорам і яркай эмацыянальнасцю жартаўлівая песня «Камар».

Шчыра, непасрэдна, задушэўна, бадзёра і весела ідзе тэатралізаваны канцэрт. Але раптам нарастае трывога, адзін з калгаснікаў моцнымі патэтычнымі словамі заклікае да абароны радзімы ў выпадку нападу варожай зграі крумкачоў — фашыстаў і самураяў.

І адразу мяняецца твар надзвычайнай сцэны. Беларускі арнамент саступае месца самалётам, танку, які рухаецца на сярэдзіну сцэны, групы калгаснікаў узбройваюцца вінтоўкамі, развіваюцца сцягі і сурова, цвёрда і пераможна гучыць песня абароны. Кожны калгаснік, увесь народ гатовы з імем Сталіна адстаяць да апошняй кроплі крыві сваю прыгожую радзіму.

Трывожны момант знікае, на сцэне вырастаюць квітнеючыя сады, над якімі паяўляецца велізарны макет ордэна Леніна, а на авансцэне ў цэнтры барэльеф таварыша Сталіна. Беларускі народ шле сваё дзякуй правадыру, настаўніку, другу і бацьку, вялікаму генію чалавецтва таварышу Сталіну.

Так заканчваецца выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці БССР, якія накіроўваюцца ў Маскву для паказу сваіх дасягненняў наведвальнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Вялікая і ўдумлівая работа праведзена кіраўнікамі выступленняў. Пастаноўшчык К. Галейзоўскі паказаў цікавую творчую думку і ўмелае выкарыстанне масавых спалучэнняў, паказаў мастацкі такт. Культурна зроблена музычнае афармленне кампазітарам Цікоцкім, з любоўю вядзе харавую частку выступлення хормейстар Нікалаевіч, вельмі добрае, з мастацкім густам, афармленне мастака Кіпніса.

На паказе прысутнічалі сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка, Грэкава, Малін, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета тав. Наталевіч, старшыня Соўнаркома БССР тав. Кісялёў, тт. Цанава, Кулагін, Захараў, Озірскі і інш. Яны далі добрую ацэнку калектывам і зрабілі рад практычных указанняў, якія палепшаць паказ мастацкай самадзейнасці ў Маскве.

Пажадаем нашым удзельнікам паказу шчаслівай дарогі і поспеху ў чырвонай сталіцы.

Кампазітар Н. ШЧЭГЛОЎ.

# ЗАСЛАЎЛЬСКІ ТЭАТР ВЫЯЗДЖАЕ НА ЎСЕСАЮЗНУЮ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧУЮ ВЫСТАЎКУ

Пасля ўсебеларускага фестываля калгасна-соўгасных тэатраў у Мінску журы былі высунуты тры кандыдаты на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку: Слуцкі, Бабруйскі і Заслаўльскі калгасна-соўгасныя тэатры.

Гэтымі днямі адборачная камісія з удзелам прадстаўнікоў Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў вырашыла паслаць на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку Заслаўльскі калгасна-соўгасны тэатр з п'есай «Партызаны» К. Крапівы.

Зараз тэатр знаходзіцца ў Мінску і ўзмоцнена працуе над удасканаленнем спектакля. Штодня ідуць рэпетыцыі. Паглыбляецца работа над вобразамі, рэпетыруюцца хоры, танцы, музычныя нумары, робіцца новае афармленне. Для дапамогі тэатру прымацаваны артысты-прафесіяналы.

У Маскву тэатр выедзе паміж 10 і 15 жніўня.

*Палескі абласны драматычны тэатр*

# „КАВАРСТВА І ЛЮБОЎ"

Палескі абласны драматычны тэатр паставіў трагедыю Шылера «Каварства і любоў».

Малады тэатр упершыню працаваў над творам высокай класікі, працаваў у цяжкіх умовах гастрольнай паездкі і выйшаў пераможцам. «Каварства і любоў» у Палескім тэатры — добры спектакль. Спектакль хвалюе гледача, а гэта самае важнае.

«Галоўная каштоўнасць «Каварства і любві» Шылера заключаецца ў тым, што гэта першая нямецкая палітычная тэндэнцыйная драма». — пісаў Энгельс. Гэта галоўная каштоўнсць шылераўскай трагедыі правільна зразумета пастаноўшчыкам В. П. Пацехіным. Адсюль гістарычна правільнае і войстрае раскрыццё вобразаў п'есы і іх узаемаадносін.

Рэжысёр Пацехін паставіў спектакль аб любві і каварстве, у якіх увасаблялася барацьба саслоўяў у Германіі эпохі «буры і націску», — спектакль аб двух прыгожых маладых людзях, асуджаных, не гледзячы на свой пратэст, на разлуку з-за саслоўнай няроўнасці. Барацьба страсцей — вось адпраўны пункт у кампазіцыйнай пабудове спектакля.

Рэжысёр падкрэслівае ўсімі тэатральнымі сродкамі сцэны, найбольш ярка характарызуючы любоў Луізы і Фердынанда, прагнасць Вурма страсць Мільфорд.

Мізансцэніроўка ў спектаклі поўнасцю падпарадкоўваецца гэтаму кампазіцыйнаму прынцыпу. Аднак, гэта не ўсюды ўдаецца рэжысёру. Так, напрыклад, залішне бытавы прысмак мае сцэна першай карціны ў доміку Мілера. Не сабрана, сумятліва праходзіць другая карціна — сцэна размовы прэзідэнта з сынам. Рэжысёру не ўдалася і вельмі адказная сцэна смерці Луізы.

Рэжысёру Пацехіну трэба, на нашу думку, больш увагі ўдзяляць скульптурнасці мізансцэн, іх стылёваму адзінству, што ім не заўсёды захоўваецца: побач з добрымі, запамінаючыміся мізансцэнамі тыпова шылераўскай рамантыкі, — напрыклад, пагроза Фердынанда закалоць Луізу, — ёсць шмат няўдалых: чаяпіцце фрау Мілер, смерць Луізы і інш.

У сэнсе акторскага выканання спектакль няроўны. Луізу іграе маладая актрыса Мілканава. Роля Луізы — яе першая сур'ёзная акторская работа. Гэта, натуральна, не магло не сказацца. Адчуваецца некаторая ўнутраная скаваннасць актрысы, месцамі сляпое падпарадкаванне рэжысёру без унутранай усхваляванасці. Але ўвогуле рысунак ролі правільны і цікавы. Маладая актрыса валодае сцэнічным абаяннем і добрым голасам. Лепшай сцэнай у яе выкананні трэба прызнаць апошняе аб'ясненне з Фердынандам, дзе яна перамагае ўнутраную скаваннасць, іграе моцна і хвалююча.

Сурыкаў правільна і пераканаўча раскрывае вобраз юнака-арыстакрата Фердынанда. Але, нажаль, актору не ўдалося адшукаць арыгінальных, свежых, запамінаючыхся акторскіх фарбаў для сцэнічнага ўвасаблення правільна зразуметага вобраза. Сурыкаў валодае добрым акторскім тэмпераментам, але чамусьці параўнальна слаба выкарыстоўвае яго.

Вельмі цікавы вобраз старога музыканта стварае ў ролі Мілера арт. Цыкаленка Мілер — Цыкаленка глыбока і свядома ненавідзіць арыстакратыю: «Увесь нязначны астатак дзён маіх аддаў-бы я, толькі-б табе ніколі не сустракацца з маёрам... Вазьмі маю старую, пракаветную галаву! Вазьмі ўсё, ўсё! Маёра-ж — бог сведка! — я не магу табе даць!» — страсна ўсклікваю Мілер. Цыкаленка прымае гэтыя словы як ключ да раскрыцця ўсяго вобраза.

У драме Шылера ёсць адно цёмнае месца: няясна, ці ведаў Мілер аб вымушаным Вурмам пісьме Луізы? Шылер толькі глуха намякае на гэта: «Будзь цвёрдай! Будзь цвёрдай, дачка! Яшчэ толькі адно так—і ўсё пераможана» — гаворыць Мілер Луізе, якая хістаецца перад настойлівым патрабаваннем Фердынанда раскрыць тайну пісьма фон Кальбу.

Цыкаленка вырашае пытанне станоўча. Так, Мілер ведае аб пісьме, ён сам даў на гэта згоду Вурму, але не з-за асабістай выгоды — выхаду з турмы, а з мэтаў глыбока прынцыповых. Ён супроць шлюбу дачкі з Фердынандам, да канца супроць. Ён лічыць, што дачка яго не можа быць шчаслівай у сацыяльна няроўным шлюбе, ён паступае так з-за любві да дачкі. У гэтым яго апраўданне. Глядач бачыць у ім паслядоўнага ворага арыстакратыі.

У сцэне аб'яснення з Фердынандам у апошнім акце Цыкаленка знаходзіць патрэбны тон. Ён бяссільны, гэты пераможаны варожымі сіламі чалавек, але ён непахісны, — гэта глыбока правільна.

Актор вельмі ўдала знайшоў грым і характэрныя рухі старога скрыпача.

Вурма іграе малады артыст Прушак, іграе няроўна. Але нам здаецца, што яго выкананне Вурма некалькі трафарэтнае, у яго Вурму ёсць нешта ад заштампаваных вобразаў тэатральных злачынцаў.

Залішне акрэслена, без нюансаў дадзена каварства Вурма. Вурм робіць свае подлыя ўчынкі не дзеля іх саміх — яго мэта авалодаць Луізай. Вурм Прушака не мае мэты ў сваіх злаўчынках, ён вельмі прасталінейны, — напрыклад, ён грубіяніць прэзідэнту, тады як шылераўскі Вурм толькі крадком язвіць яму. Каварства таму і каварства, што яно захаванае, не выяўляецца знешнімі праявамі. Мы пераконаны, што малады здольны артыст у працэсе выканання ролі паглыбіць і дапрацуе яе.

Лэдзі Мільфорд іграе арт. Даніловіч. Яна ўпаўне правільна трактуе вобраз як персанаж адмоўны. Лэдзі Мільфорд арыстакратка па паходжанню, усемагутная фаварытка па становішчу, апранутая ў Шылера ў тогу дабрадзейнасці. Гэта была ўступка цэнзуры. Зняць гэту тогу дабрадзейнасці, паказаць, што дабрачыннасць лэдзі Мільфорд не больш, як прыгожы жэст—цяжкая акторская задача. Даніловіч справілася з гэтай задачай.

Артыстка вялікага сцэнічнага абаяння, яна, нажаль, шмат губляе з-за даўлеючых на яе ігры штампаў заламвання рук у сцэнах страсці, патэтычных ускліканняў і г. д. Прыкметна работа актрысы па выпраўленню гэтага недахопу. Яна правільна робіць, змагаючыся з ім шляхам дасканалай дэталізацыі сцэн, адшукання свежых фарбаў у абмалёўцы перажыванняў Мільфорд. Так напрыклад, удала знойдзенай актрысай дэталлю трэба прызнаць машынальнае абрыванне пялёсткаў з кветкі ў фінальнай сцэне аб'яснення з Фердынандам. Шлях знойдзен правільны, пры ўпартай працы і дапамозе рэжысёра артыстка зможа пазбавіцца ад банальных, заштампаваных прыёмаў.

Фон Кальб — першая сур'ёзная роля арт. Кудраўцава ў драматычным спектаклі, у мінулым ён—артыст балета.

З роляю фон Кальба ён справіўся добра. Пусты свецкі балбатун фон Кальб раскрываецца Кудраўцавым з вялікім гумарам. Артыст умее знаходзіць характэрныя рысы вобраза ў жэстах, позах, хадзе—вельмі каштоўная ўласцівасць, узятая ім з старой яго спецыяльнасці.

Трэба, аднак, зазначыць, што актор бярэ залішне шпаркі тэмп. Фон Кальб — чалавек ужо не малады, ён не столькі ў сапраўднасці «лётае», колькі прэтэндуе на элегантнасць і лёгкасць рухаў.


У невялікай ролі камердынера арт. Кліенка стварае адчувальны, запамінаючыйся вобраз старога, сына якога герцаг прадаў у якасці салдата ў Амерыку. Расказ аб падаўленні пратэсту ў палку навабранцаў па-сапраўднаму моцна і хвалююча данесен артыстам.

Каштоўнай якасцю спектакля з'яўляецца яго насычанасць музыкай, якая арганічна ўплятаецца рэжысёрам і дырыжорам тэатра Галіным у тканіну спектакля. Добра зроблен невялікі музычны ўступ, які пачынаецца суровымі музычнымі фразамі Баха, пераходзячымі пры адкрыцці заслоны ў віяланчэльнае выкананне Мілерам бетховенскай санаты, тэма якой паўтараецца Фердынандам і Луізай у 8-й карціне, у сцэна трагічнага аб'яснення. Добра знойдзен прыём: прараў страсці Мільфорд у бурнай ігры на фартэп'яне.

Мастак спектакля Лук'янаў правільна перадае гістарычную своеасаблівасць эпохі і нацыянальна-бытавыя асаблівасці. Афармленне, пры вялікай эфектнасці і мастацкасці, вельмі партатыўнае, што вельмі важна для тэатра, які часта робіць свае гастрольныя паездкі па вобласці.

Першы крок тэатра ў асваенні класікі зроблен добра.

**Ант. СЕГЕДЗІ.**



Сцэна з спектакля «Каварства і любоў» Шылера ў пастаноўцы Палескага абласнога драматычнага тэатра.



«Выступленне Серго Орджанікідзе на II франтавым з'ездзе Советаў у Мінску» — эскіз карціны маст. Е. Ціхановіча для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Фота І. Каплінскага.

# КАНЦЭРТ Г. К. ПУКСТА Ў ГОМЕЛІ

Днямі Гомельскі абласны аддзел па справах мастацтваў арганізаваў вечар творчасці беларускага кампазітара Грыгорыя Канстанцінавіча Пукста. У перапоўненым памяшканні летняга тэатра парка культуры і адпачынку грамадскасць горада ўсебакова пазнаёмілася з творчасцю таленавітага земляка. Канцэрт пачаўся ўступным словам лектара-музыказнаўца В. Я. Трайніна. Тав. Трайнін падрабязна спыніўся на дасягненнях у галіне музычнага мастацтва ордэнаноснай Беларусі, расказаў аб творчым шляху Грыгорыя Канстанцінавіча.

Грыгорый Канстанцінавіч нарадзіўся ў 1900 годзе, у сям'і чыгуначнага слесара. Сам ён таксама быў слесарам і машыністам. З ранніх год праяўляе Пукст вялікія музычныя здольнасці. Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі ён стварае рад масавых песень. У 1923 годзе паступае ў Маскоўскую кансерваторыю. З 1927 года яго творчы шлях знамянуецца стварэннем сюіты на беларускія народныя тэмы для сімфанічнага аркестра. Ён стварыў звыш 50 твораў на народную тэматыку, сімфанічную паэму аб Чырвонай Арміі і маршале Варашылаве, вакальныя творы (рамансы). Затым тав. Пукст піша квартэт, стварае музыку да драматычных п'ес, сваю 1-ю сімфонію.

Акрамя творчай працы, Г. К. Пукст вядзе педагагічную работу ў Гомельскім музычным вучылішчы, а таксама ў галіне самадзейнасці.

Паказ творчасці Г. К. Пукста пачаўся выкананнем 1-ай сімфоніі сімфанічным аркестрам Белдзяржфілармоніі (дырыжор праф. І. А. Мусін). Сімфонія малюе карціну мінулага Беларусі, змест якой — гераічная барацьба беларускага народа за сваё вызваленне. Затым сімфанічны аркестр выканаў сюіту, пабудаваную па тэматыцы 4-х беларускіх песень.

Гэтыя творы былі выкананы з вялікім майстэрствам, гучалі абаяльна і свежа.

Струнны квартэт у складзе засл. арт. рэсп. Бяссмертнага (1-ая скрыпка) і артыстаў Афанасьева (2-ая скрыпка), Парскага (альт) і Шапіра (віяланчэль) выканаў дзве фугі. Творы гэтыя прагучалі поўнакаштоўна і прадумана.

Вакальная творчасць была паказана выкананнем артысткай Позняк раду твораў на словы беларускіх паэтаў і апрацовак беларускіх народных песень: «Лугам зелянёнькім», «На нашым полі», «Ах, палянка» і «Звіні, маладосць». Таксама была паказана і харавая творчасць Пукста ў выкананні харавога калектыва фабрыкі «Гомтэкстыль» пад кіраваннем Шапіра. Калектыў выканаў «Песню пра Сталіна», песні «Крапіва», «Лён» і яўрэйскую народную песню ў апрацоўцы Г. К. Пукста.

Г. К. Пукст зараз працуе над стварэннем 2-й сімфоніі для прадстаячай дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

**Аляксандр ШАРШАТКІН.**

## БАБРУЙСКАЯ МУЗШКОЛА ПАДРЫХТАВАНА ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

У Бабруйскай музычнай школе поўнасцю закончана падрыхтоўка да новага навучальнага года. Закончан рамонт памяшкання. Канцэртная зала, усе пакоі прыведзены ў культурны выгляд. Апалам школа забяспечана на цэлы год. Закуплены новыя інструменты, у прыватнасці духавыя, і ў пачатку новага навучальнага года пры школе арганізуецца духавы аркестр. Адкрываецца таксама спецыяльны клас народных інструментаў.

Запрошан рад новых педагогаў, у тым ліку былыя вучні Бабруйскай школы, скончыўшыя ў гэтым годзе музычныя школы ў Менску і Гомелі.

Да новага навучальнага года адкрываюцца вячэрнія вакальныя курсы для дарослых. Школа рыхтуецца да прыёму новых вучняў: усяго будзе прынята 100 дзяцей, з іх 50 у дашкольныя групы.

Перад пачаткам навучальнага года пры школе будзе арганізаван семінар для педагогаў.

**І. Ц. СТЭЛЬМАК.**

ЗАМЕТКІ ЧЫТАЧА

## ВЕРШАПЛЁТЫ

«Чаму-ж не пець,
Чаму-ж не плесці вершаў» —
прызнаецца пачынаючы паэт І. Ляндрэс.

Прагледзеўшы апошнюю старонку ўбарысаўскай газеце «Бальшэвіцкая трыбуна», чытач адразу згаджаецца, што І. Ляндрэс мае рацыю: у Барысаве сапраўды можна плесці вершы, і яны будуць надрукаваны ў газеце.

У літаратурнай старонцы І. Ляндрэс прадстаўлен двума вершамі. Адзін з гэтых вершаў называецца «Радасць». Што толькі не радуе чулага паэта! У невялічкім творы мы чытаем і пра рыштаванні, і пра жыта, пра маладосць і вазёры, пра выбары ў советы і пра блакітнае неба. Усё гэта так захапляе песняра, што ён ад паўнаты пачуццяў прызнаецца, што ён не можа «не плесці вершаў». Ці дзіўна, што даводзіцца чытаць такія радкі:

Хачу спяваць, дзе рытм у будаванні,
І там, дзе сам народ паэт рыфмуе,
Таму што я ўзрос на рыштаванні
І кроў у такт з краінаю пульсуе.

У другім вершы паэт здзіўляе яшчэ больш вобразным... наборам слоў:

Вораг, вораг уцякае,
Вочы загарэліся
Рашучасцю. Стрэліў Пётра,
Па ворагу стрэліў.

Другі паэт, Дубавіцкі, узрадаваў чытача класічным узорам тарабаршчыны:

Это зарубежные солдаты
Зарубежной вражеской страны.

Альбо:

Просчитались гады! Не удастся
Вам вредить в родном нашем краю.

Не будзем больш таміць чытача вытрымкамі. Уся старонка стракаціць такімі «перламі». Відаць, рэдактар барысаўскай газеты штампуе ўсё, што яму трапляецца пад рукі.

**М. ЛАЗАРАЎ.**

## Прэм'ера Рагачоўскага тэатра

30 ліпеня Рагачоўскі калгасны тэатр паказаў прэм'еру «Пагібель воўка» у пастаноўцы рэжысёра Рашалава.



«Уцяканне белапалякаў з Мінска» — эскіз карціны маст. Каплана для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».
Фота І. Каплінскага.

**В. ВЯРХОЎСКІ**

# *У вераснёвы вечар*

Апавяданне

Па сцежцы крочыў малады чалавек. Гэта быў трактарыст суседняга калгаса Мікола Панцялееў. Калгаснікі называлі яго проста Панцялейчык. Калючыя галінкі ельніка і гнуткі папаратнік ссыпалі яму на боты расу. Ад гусцеючай цемры яго плечы рабіліся яшчэ больш сутулаватымі. Стромкія сосны скрыпелі і матлялі верхавіннем, прыглушана і працягла — шумелі. Поплеч барабаніла лісцем неўгамонная асіна. А кавалкі струхнелых пнёў свяціліся бялесным водсветам.

У нутро Панцялейчыка закрадаўся незразумелы жах. Здавалася, выйдзе зараз хтосьці з-за кустоў і загадае не варушыцца.

Жадаючы хоць крыху развеяць нахлынуўшы страх, Панцялейчык засвістаў. Рэха далёка панесла яго свіст, і ён яшчэ больш ссутуліўся. «І панесла-ж нячыстая сюды, быццам дарогі людской не было», — злаваў на самаго сябе Мікола, уздрыгваючы пры кожным хрумстанні галінкі. Ён не заўважыў нават таго, што букет, які быў у яго ў руках, напалову рассыпаўся, разгубляў свае пахучыя пялёсткі.

Вышаўшы на дарогу, Панцялейчык сцёр рукавом з твару халодны пот і крыху супакоіўся: перад сабой ён убачыў кляновыя прысады і сілуэты цагляных будынкаў калгаса «Пераможац».

Не ў асаблівым гумары быў сёння Панцялейчык. Свежы малюнак сустрэчы з дырэктарам МТС, дасціпныя дырэктаравы словы і зараз нажом рэзалі сэрца.

— Не жадаеце працаваць, таварыш Панцялееў? Калгаснікі на вас скардзяцца.

Што мог адказаць Мікола? І ён маўчаў. Маўчаў таму, што, сапраўды, мала цікавіўся маторам, а калі былі непаладкі, ён сам не выпраўляў іх, а прасіў таварышоў. У самога, як ён казаў ім, не было часу.

— Чым-жа я вінават, — апраўдваўся ў думках Панцялейчык. — Тут вінавата прырода, інстынкт. Хіба-ж супроць іх папрэш. Вось, пайду і скажу ёй...

З гэтай мэтай наблізіўся к калгасу Мікола. Не ўчуў, як на завароце дарогі яго здагнаў Павел.

— Куды ідзеш? — спытаўся ён, усміхаючыся і абцягваючы гімнасцёрку.

Мікола ад нечаканасці ўздрыгнуў.

— Як куды? Вядома, на сход.

— А кветкі ў цябе чаго?

— Такая ўжо ў мяне натура: без кветак ні кроку, — іранічна адказаў Панцялейчык.

— Гэта я чуў,—не адставаў Павел,— але-ж не падобна на тое, каб на сход ішоў.

— Дык, па-твойму, я хлушу?

— Вядома. Вось, у армію пойдзеш, адвыкнеш.

Панцялейчык злосліва адышоў на другі бок дарогі. Памкнуўся было штосьці калючае сказаць Паўлу, але стрымаўся. «Мала што можа здарыцца, — думаў ён, — лепш мець сто сяброў, чым сто рублёў».

У небе загараліся зоры. Усё навакол прыціхла і закрылася туманам. З галаслівымі прыпеўкамі праімчаліся начлежнікі, пакінуўшы за сабою слуп пылу. Зямля глуха і адрывіста гула пад капытамі коней.

Мікола быў недалёка ад калгасных прысад, калі да яго зноў падышоў Павел.

— Чаму-ж ты адстаеш, ужо амаль усе ворыва заканчваюць, а ты... Праўду людзі гавораць — слаба працуеш. А гэта не да твару комсамольцу.

Панцялееў здзіўлена перавёў позірк на Паўла, жадаючы ў яго вачах убачыць дакорлівыя агенькі, але не заўважыўшы іх, сказаў:

— Ды што ты мяне, нібы дзіцё якое, угаворваеш... Не тонкі ход.

Павел гулка зарагатаў. Мікола ад нечаканасці ўздрыгнуў і паскорыў крокі.

— Ну, і ну, — толькі і мог вымавіць Павел скрозь смех. У той-жа момант яму стала прыкра за свой смех. Ніякавата стала Паўлу за свайго таварыша. Столькі год пражылі разам, разам вучыліся ў школе. Такім і тады быў Панцялееў. Грамадская работа яго ніколі не кранала. Часта прапускаў лекцыі, туляўся цэлымі днямі па карчэўю ды вербалозніку, шукаючы птушак.

Павел усёй сваёй істотай зразумеў, якая велізарная і адказная задача ўскладаецца на яго: трэба дапамагчы сябру пазбавіцца ад той заскарузласці і гультаяватасці, якая апанавала ім. Таму, звяртаючыся да свайго спадарожніка, Павел голасам, поўным таварыскай цеплыні, сказаў:

— Памыліўся ты. Запомні: не «тонкі ход», як ты казаў, а Дон-Кіхот.

Мікола мала прыслухоўваўся да слоў сябра, бо яго позірк блукаў па прахожых, якія ўзад і ўперад хадзілі ў змроку вуліцы. Варта было прайсці дзяўчыне, як у Панцялейчыка захапляла дух. Ён у кожнай з іх быў гатоў бачыць тую, якая ўжо на працягу некалькіх тыдняў не давала супакою яго пачуццям, якой збіраўся ён выказаць усё, што набалела за гэты час на сэрцы.

Да высокага ганку хаты конюха Ляшчынскага яны падышлі амаль разам.

— Вось на які ты сход, — разважліва прагаварыў Павел і паглядзеў на занавешаныя шыбы.

Маўчалі. На твары ў Паўла блукала пачуццё спагады і няёмкасці. У лісці маладога бэзу і акацыі шумеў вецер. Яшчэ большае ажыўленне і жвавасць выклікала ў Панцялейчыка раптоўна ўзнікшая мелодыя. Гукі былі спачатку ледзь чутны, затым то павольна ўзрасталі, то падалі зноў. Яны былі настолькі лірычнымі і прыгожымі, што, здаецца, сеў-бы, заплюшчыўшы вочы, і доўга-б, доўга слухаў. Гэта іграла на піяніна планерыстка Вера.

— Павел, — звярнуўся Мікола,—я... я раней з ёю пазнаёміўся, яшчэ да твайго прыходу з арміі, ты-ж ведаеш...

— Я да Веры за кансультацыяй па планернай справе, — спрабаваў было выйсці з няёмкага становішча Павел.

Невядома, чым-бы скончылася размова двух таварышоў, каб да ганку не пад'ехаў на матацыкле сам конюх Ляшчынскі.

— Радасць якая, — сказаў ён, спыніўшыся. — Гэта-ж марыў столькі. Раней кучарам у пана быў, а цяпер уласны матацыкл маю. І, як-бы ў пацвярджэнне сваёй невыказнай радасці, апісаў поўны круг па двары. Аж дух заняло ў Панцялейчыка.

— Садзіся, чаго вочы вылупіў? — звярнуўся да яго Ляшчынскі. — Трымайся. За пояс бярыся. Вось так. І матацыкл з аглушальным трэскам выехаў на вуліцу.

— А, Паўлуша! Даўно чакаю.

Гэтыя словы належалі стройнай, сярэдняга росту дзяўчыне. Ваенная гімнасцёрка з блакітнымі пятліцамі і партупеяй праз плячо надзвычай пасавалі да яе твару.

— Мікола паехаў, твой бацька павёз, вось і чакаю, — гаварыў Павел, паціскаючы руку Веры.

За Ляшчынскім навыперадкі бег гурт дзяцей.

— Ну, і набраўся гора, — скардзіўся Ляшчынскі, аціраючы з шырокага ілба пот. — Ну, і трус вы, Панцялееў, ой, і трус. Гэта-ж тры разы машыну спыняў. Ты, Верка, на планеры яго пакатай, прывучы да смеласці.

Мікола, прыводзячы ў парадак раскіданыя валасы, сарамліва падаў руку Веры.

— Я жадаю асабіста пагутарыць з табой, Вера, — нерашуча сказаў ён.

— Пайшлі, толькі не надоўга, — адказала Вера. — А ты, Паўлуша, ідзі з бацькам пагавары.

— Ёсць! — узрадавана казырнуў засумаваўшы было Павел.

Вера і Мікола ішлі ўздоўж кляновай алеі калгаснага парка. Некалькі разоў намагаўся Мікола ўзяць Веру пад-руку, але не хапала смеласці. Разумеючы гэта, Вера пайшла насустрач яго жаданню. Цеплыня ад яе мускулістай рукі электрычнымі іскрамі прабягала па целу Міколы.

— Які туман, Вера, а? — імкнуўся ён завязаць гутарку.

— Бачу.

— А раса так і блішчыць на кляновых лістах.

— Вядома.

І Міколу стала прыкра за сябе, за свой лексікон. А жадаў столькі сказаць, падзяліцца думкамі. Гэта няёмкасць кіпцюрамі драпала сэрца.

— Ты вінавата, вось што, — вырвалася з грудзей Міколы.

— Чаму гэта? — здзівілася Вера.

— Я ночы не сплю, пра цябе ўсё думаю, а спачування — ні кроплі.

— І не працуеш над сабой, — дадала Вера.

— А як-жа я працаваць буду, калі інстынкт гэты залез у нутро, хоць гвалт крычы.

— Ну, і што?

— Вера, гэта... ну, ты-ж сама ведаеш...

— Не выйдзе. Які-ж ты мне спадарожнік у жыцці будзеш, калі ў рукі сябе ўзяць не можаш? Ды і працаваць лянуешся. А здольнасці ў цябе ёсць, і яшчэ якія здольнасці.

Лепей-бы сто перуноў ляснулі Міколу, чым гэтыя простыя словы дзяўчыны. Рукі яго міжволі апусціліся. Ён прыхіліўся да клёна і застыў у задуменні.

— «Радасць адчуваць не цяжка, лепш у горы моцным будзь», — ціха і павольна прагаварыў Мікола аднойчы чутыя ад таварыша словы Шота Руставелі.

— Вось дзівак, дзе гора знайшоў. Вады — справа нажыўная. Толькі жаданне патрэбна. Думаеш, дарэмна Максім Горкі пісаў, што «колькі сябе знадворку не фарбуй, усё адно сатрэцца?» Зусім не дарэмна.

Мікола адламіў з невялікага куста хрупкага алешніка галінку і, ламаючы яе на драбнюткія кавалкі, адказаў:

— Дзе-ж каханне тады? Я больш кахаць нікога не буду.

— Каханне ў працы, Мікола. Без працы яно немагчыма.

— Дык я-ж працую.

— Нядобрасумленна працуеш.

Мікола маўчаў. Глядзеў у вочы Веры і прагна лавіў кожнае слова. Яна гаварыла далей.

— Ты павінен быць першым у працы, каб апраўдаць давер'е радзімы, якая так аб табе клапоціцца. Тады і дзяўчаты будуць цябе паважаць. Ты прыгожы хлапец, апранаешся прыгожа, а вось галоўнага няма. Станеш прыкладным, вось тады і пагутарым.

Мікола задумаўся. Доводы Веры былі простыя, ясныя, і не знаходзіў Мікола ніякага апраўдання, толькі адчуваў сябе няёмка. І таму, калі вярнуліся з парка, Мікола з прапановай Паўла пайсці ў кіно разам не згадзіўся. Яму хацелася застацца аднаму, сабраць свае думкі, праверыць іх.

Не дзень і не два быў хмурным Панцялееў. На работу стаў з'яўляцца раней за ўсіх. Стаў часцей наведваць бібліятэку.

Яшчэ больш адчуў сваю нікчэмнасць Мікола пасля выпадку з даяркай Нінай. У той вечар Ніна ішла на вяселле ў суседні калгас. Праходзячы каля трактарнай брыгады, усміхнулася ветла і радасна. Маленькія ямінкі на яе ружовых шчоках паранілі сэрца Міколы. Ён забыўся тады на ўсё. Імкнуўся наладзіць з ёй сустрэчу. Сустрэча адбылася хутка і нечакана. На вечары ў клубе, ласкавая і гаваркая, падышла да яго Ніна і запрасіла патанцаваць. Міколу-ж зроду і ў галаву не прыходзіла практыкавацца ў розных там танцах. А трапіўся яшчэ камбайнер Грышка, ён тое толькі і рабіў, што смяяўся з Міколы.

— Хлопцы, глядзі, у Панцялеева ногі, як граблі тыя.

На двары было зусім цёмна, калі Ніна і Мікола пакінулі клуб. Ноч агарнула іржэўнікі, прытаілася ў высокіх кустах, разлілася ў лузе.

— Эх, Ніна, каб ты ведала мае пачуцці, — з глыбокім уздыхам прагаварыў Мікола. — За каго-б ты замуж выйшла?

— Толькі не за цябе, — адказала Ніна, ведаючы, куды хіліць Панцялееў. — Я-ж знатная даярка, а ты? Гавораць, працаваць лянуешся.

А ён яшчэ ўчора абдумваў, куды паставіць стол і шафу, калі Ніна прыдзе да яго жыць. Мары, якія спачатку пераліваліся вясёлкавым ззяннем і ўсё ўзрасталі, зараз як мыльны пузыр разляцеліся на безліч нябачаных кропелек.

Да здзіўлення Ніны, Панцялееў раптоўна падаў ёй руку і накіраваўся да хаты.

— Мікола, што з табой? — устрывожылася яна.

— Нічога асаблівага. Бывай.

«Вось, толькі часу-б мне. Заўтра-ж заключаю дагавор на спаборніцтва, хаця-б сабе з Верай, не страшна».—думаў Панцялееў. Разам з гэтымі думкамі нёс на сабе горкую крыўду ў сваім сэрцы Мікола. Яму хацелася адчуць штосьці новае, радаснае. Непамерна ўзрастала жаданне заслужыць агульную ўвагу таварышоў. «Што мне перашкаджае заваяваць такі аўтарытэт, як у Веры альбо ў брыгадзіра Паўла?» Думкі нарасталі, згуртоўваліся ў адно суцэльнае, увасаблялі радасць. Ён быў упэўнен у сваёй перамозе.

Пяшчотны вецер нёс з ваколіцы песні—трапяткія, жывыя. І вышэй усіх узнімаўся звонкі і чысты, як крыніца, голас Веры: «Рожь качается, наливается, где ж ты друг мой, дорогой». А паабапал сцежкі затоена шумелі верасы, схілялі свае кволыя сцябельцы насустрач Міколу. Сэрцам усё больш і больш авалодвала прагнасць чагосьці вялікага, творчага, прагнасць працы, нястомнай і крапатлівай.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1332.